ВЕРАСЕНЬ
14
СУБОТА
№ 28 (484)
1940 год
ЦАНА 20 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН
ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА
СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ
БССР
І УПРАЎЛЕННЯ ПА
СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ
ПРЫ СНК БССР

Трыумф з'еднанага народа

Прайшоў год з часу гістарычнай падзеі — вызвалення Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі з-пад панскага прыгнёту. Велічнай датай увайшоў у гісторыю нашага народа дзень 17 верасня 1939 года — дзень аднаўлення гістарычнай справядлівасці, дзень выдатнейшай перамогі сталінскай знешняй палітыкі нашай радзімы, палітыкі міру і дружбы народаў.

17 верасня 1939 года часці гераічнай Чырвонай Арміі, доблесна выпаўняючы заданне большэвіцкай партыі і совецкага ўрада — волю ўсяго совецкага народа, перайшлі граніцу, якая два дзесяцігоддзі падзяляла нашу зямлю, працягнулі руку дапамогі народам — братам нашым, якія доўга пакутвалі ў краіне-турме пад белапанскім ігам.

З імем натхніцеля перамог — вялікага Сталіна, пад чырвонымі сцягамі магутнай радзімы соцыялізма, несучы мір і шчаслівае жыццё народам, рушылі ў слаўны вызваленчы паход воіны Чырвонай Арміі... Змецен пагранічны дрот. У панічным страху разбягаюцца пад ударамі чырвоных часцей белапанскія банды. Рокат матораў на зямлі і ў паветры, хвалюючыя баявыя песні, — ідзе Чырвоная Армія! А насустрач — магутная хваля народнай любві і лікавання. Маткі сустракаюць сыноў, сыны—сваіх родных, блізкіх. Загучала вольнае роднае слова. Разагнуў спіну народ, заспяваў народ!.. Невымерна шчасце вызвалення! Нельга забыць гэтых радасных дзён. І не забудзе ніколі совецкі народ, радзіма, гісторыя імён герояў—воінаў Чырвонай Арміі, аддаўшых жыццё за трыумф чырвонага сцяга!

Народы Заходняй Беларусі свабодна выразілі сваю волю, ажыццяўляючы свае заветныя мары і надзеі, — дзяржаўнай уладай абралі тую, якая сапраўды забяспечвае вольнае і шчаслівае жыццё працоўным,—совецкую ўладу, сталі грамадзянамі краіны Сталінскай Канстытуцыі. Пад сцягам краіны соцыялізма адбылося з'еднанне беларускага народа.

Новае жыццё, як багаты ўраджай, закрасавала на вызваленай зямлі. Дзякуючы бацькаўскім клопатам партыі Леніна — Сталіна, совецкага ўрада, дзякуючы дапамозе братніх совецкіх народаў, народы заходніх абласцей Совецкай Беларусі хутка і ўпэўнена пайшлі па соцыялістычнаму шляху.

Зямля, што была зрэзана межамі на жабрацкія загоны, зямля, што была ў ярме панскага ўладарavання, за кароткі час — адзін толькі год—цудоўна змяніла сваё аблічча. Зямля дала свой першы дар, шчодры ўраджай сапраўднаму гаспадару свайму—народу. Выраслі першыя калгасныя гаспадаркі—фарпосты соцыялістычнага земляробства на вызваленай зямлі. Новымі, соцыялістычнымі сталі адносіны да працы. Стаханаўскі рух ахапіў заводы, фабрыкі—рэканструіраваныя, пашыраныя, працуючыя на поўную сваю сілу. Подвігам соцыялістычнай працы з'явілася пабудова ў рэкордны час, за 210 дзён, магутнай воднай магістралі—Днепра-Бугскага канала, з'еднаўшага Дняпро праз Прыпяць з Заходнім Бугам. Гэты новы водны шлях адыгрывае вялікую ролю ў развіцці народнай гаспадаркі заходніх абласцей.

Заходняя Беларусь была звездзена польскімі панамі на ўзровень калоніі. На спустошанай, зруйнаванай, абнішчалай зямлі пакутвалі пад невымерна-цяжкім прыгнётам абяздоленыя беларускія, яўрэйскія масы працоўных. І цяпер з кожным днём усё больш і больш залечваюцца раны, нанесеныя заходне-беларускім абласцям шматгадовай драпежніцкай каланізатарскай палітыкай панскай Польшчы. Заходнія абласці Совецкай Беларусі ператвараюцца ў квітнеючы край усебакова развітай прамысловасці, багатай сельскай гаспадаркі, перадавой культуры.

Сагрэтыя сталінскімі клопатамі соцыялістычнай радзімы, сонцам Сталінскай Канстытуцыі, разгортваюцца ва ўсёй велічы творчыя сілы разняволенага народа. Зашумелі скаваныя раней жыватворчыя крыніцы народнай творчасці. Зямлю апавілі песні,—прыгожыя, як здабытае шчасце, хвалюючa-радасныя, як светлыя думы, народжаныя гарачымі пачуццямі любві і ўдзячнасці народа да вялікай і мудрай партыі Леніна-Сталіна. Таленавітыя сыны і дочкі народа выйшлі на шырокі шлях творчай працы.

Ажыццяўленне мудрай ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, палітыкі дружбы народаў, забяспечыла найярчэйшы росквіт соцыялістычнай па зместу, нацыянальнай па форме культуры беларускага, яўрэйскага, польскага народаў.

Заходняя Беларусь у ярме польскіх паноў была непісьменнай, культурна адсталай. Не было ніводнай школы на беларускай мове. Непісьменнасць сярод беларускага сялянства дасягала 80 проц.

Цяпер у заходніх абласцях Совецкай Беларусі паспяхова разгортваецца ўсеагульнае навучанне. У 1939—40 навучальным годзе адкрылі свае дзверы для дзяцей працоўных 1288 новых школ, 4 інстытуты. Адкрыта 8 музеяў, 80 масавых бібліятэк, разгарнулі актыўную дзейнасць у галіне палітычнага і культурнага выхавання мільёнаў працоўных школы дарослых, клубы, дамы соцыялістычнай культуры.

Заходняя Беларусь не мела прафесіянальнага мастацтва. Польскія паны ўсімі сродкамі душылі культуру беларускага і яўрэйскага народаў.

У заходніх абласцях Совецкай Беларусі створаны і плённа творча працуюць тэатры, культурна выхоўваючы гледачоў гарадоў і вёсак на лепшых узорах класікі, совецкай драматургіі. У Пінску і Барановічах—абласныя беларускія драматычныя тэатры, паказаўшыя свайму гледачу рад п'ес беларускіх драматургаў. У Гродні вырас Дзяржаўны польскі драматычны тэатр, у рэпертуары якога лепшыя творы Шылера, Фрэдро, Шоу. У Беластоку — яўрэйскі драматычны тэатр, паставіўшы п'есы Шэкспіра, Шолам-Алэйхема. У Брэсце арганізуецца рускі тэатр. Апрача гэтага, актыўна абслугоўваюць гледачоў, несучы мастацтва ў глыб народных мас ансамблі Беластоцкай філармоніі, сярод якіх асабліва вылучаецца ансамбль песні і пляскі, беластоцкія яўрэйскія тэатры—мініятур і перасовачны, лялькавыя тэатры і іншыя мастацкія калектывы. Паказалі свае творчыя дасягненні працоўным заходніх абласцей і старэйшыя тэатры рэспублікі — Дзяржаўны беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга, Дзяржаўны Віцебскі драматычны, Дзяржаўны яўрэйскі драматычны, Рэспубліканская філармонія, Тэатр юнага гледача і іншыя мастацкія калектывы рэспублікі. Іх гастрольныя паездкі з'явіліся вялікай культурнай падзеяй для заходніх абласцей.

Жудасна-цяжкім, беспрасветным было становішча інтэлігенцыі, асабліва інтэлігенцыі народаў Заходняй Беларусі, пад панскім ігам.

Неабсяжна шырокія гарызонты працы, творчай дзейнасці адкрыла перад інтэлігенцыяй, у прыватнасці перад майстрамі мастацтваў, совецкая ўлада.

Польскі рэжысёр А. Венгерка, яўрэйскі рэжысёр А. Марэўскі, беларускі фальклорыст і кіраўнік ансамбля песні і пляскі Р. Шырма, як і сотні іншых майстроў усіх галін мастацтваў, атрымалі пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі выдатнейшыя магчымасці для здзейснення сваіх творчых мар, для натхнёнай працы на карысць свайго народа.

Плённа творча працуюць жывапісцы, скульптары, графікі заходніх абласцей. Разам з усімі мастакамі Совецкай Беларусі яны рыхтуюць новыя работы —творы аб нашай шчаслівай рэчаіснасці і гераічнай гісторыі нашага народа да надыходзячай выстаўкі «Ленін і Сталін—арганізатары беларускай дзяржаўнасці».

Выхоўваецца маладое пакаленне кадраў мастацкай інтэлігенцыі ў музыкальных і мастацкіх вучылішчах і школах, адкрытых у заходніх абласцях.

Дамы народнай творчасці клапатліва дапамагаюць творчаму росту і ўдасканаленню талентаў, вылучаемых з глыбінь народа, з мастацкай самадзейнасці, якая дасягнула ўжо значнай ступені развіцця, зрабілася шматграннай і масавай, дэманстрыруючы магутны ўздым творчых сіл народа.

Беларускія паэты — дэпутат Вярхоўнага Совета СССР Філіп Пестрак, Максім Танк, Ніна Тарас, польскія пісьменніцы Яніна Бранеўская, Елена Сэльм, яўрэйскія пісьменнікі Д. Міцмахер, І. Акрутны, Б. Геллер і іншыя літаратары заходніх абласцей Совецкай Беларусі сустракаюць слаўнае свята вызвалення — 17 верасня новымі кнігамі, новымі творамі. У гэтых творах — мужны голас народа, які перанёс вялікія выпрабаванні і пакуты, які гераічна змагаўся з сваімі адвечнымі ворагамі — польскімі панамі. У гэтых творах — горды голас пераможцаў, вольных і шчаслівых грамадзян совецкай краіны, будаўнікоў соцыялізма.

Гістарычныя дні вызвалення Заходняй Беларусі, з'еднанне беларускага народа знайшло шырокае адлюстраванне ў творчасці ўсіх пісьменнікаў Совецкай Беларусі. Гэтым выдатнейшым падзеям прысвечаны новыя творы народных паэтаў БССР Янкі Купалы і Якуба Коласа, пісьменнікаў З. Бядулі, М. Лынькова, К. Чорнага, паэтаў П. Броўкі, П. Глебкі і многіх іншых. Але ўсебаковае і поўнае адлюстраванне велічных дзён гісторыі, — дзён з'еднання беларускага народа,—у творах мастацтва — тэатральнага, выяўленчага, музыкальнага, у творах літаратуры — надзённая творчая задача пісьменнікаў і майстроў мастацтваў у іх барацьбе за стварэнне выдатнейшых, класічных узораў мастацтва і літаратуры нашай соцыялістычнай эпохі.

Ярчэйшымі поспехамі працы, творчасці, умацавання магутнасці сваёй зямлі, уздыму баявой, мабілізацыйнай гатоўнасці адзначае радаснае ўсенароднае свята — 17 верасня — з'еднаны беларускі народ.

Па шляху трыумфальных перамог, сонечнаму шляху комунізма, у шчаслівай сям'і 193-мільённага совецкага народа ідзе з'еднаны беларускі народ пад вадзіцельствам большэвіцкай партыі, пад вадзіцельствам мудрага правадыра, бацькі і настаўніка народаў — вялікага Сталіна.



І. В. Сталін. Скульптура засл. дзеяча мастацтваў БССР, ордэнаносца З. І. Азгура.

Фота І. Каплінскага.

М. Танк

ПРАВАДЫРУ

Ад зямлі, асвабоджанай з пут, ад рэк ясных, нізінных,
Дзе калышыцца неба блакітная шыр,
Ад шчаслівых людзей ужо вольнай краіны—
Шлём сваё прывітанне табе, правадыр!
Прывітанне гарам і даліне Карталы,
Ўзгадаваўшым на радасць народаў арла,
І пяюць пра цябе струны нашых цымбалаў,
Пра цябе наша песня па свету прайшла.
А нядаўна, калі яшчэ ў горы жылі мы,
Калі слёзы збіралі з сваёй працы, з сяўбы,—
Нам паходняй было тваё гордае імя,
Было ззяннем і заклікам да барацьбы.
Ты натхняў нашу песню, гартаваў яе крыллі,
І яна не блудзіла, знаходзіла шлях,
З казематаў астрожных, рвучы краты і сілы,
Да цябе летучы, да зор ясных Крэмля.
І сягоння, калі ў шчаслівай сям'і мы
Сабраліся ў бяседзе, за святочным сталом,
Пра цябе пяюць горы, нівы, рэкі радзімы,
Пра цябе свае шчырыя песні пяём.
Ты запальваеш нам пуцяводныя зоры
І вядзеш па шчаслівай дарозе народ,
Нашым нівам даеш залатыя уборы,
Нашым песням даеш сакаліны палёт.
Хай вачэй тваіх сонца гарыць над палямі,
Каб квітнела багаццем і шчасцем зямля;
Хай шумяць твае годы баявымі сцягамі
Над краінай маёй, над зубцамі Крэмля.

Вілейка, 1940.

ВЫДАТНЫЯ ЗДАБЫТКІ ПРАЦЫ

Сустракаючы першую слаўную гадавіну вызвалення, хочацца падсуміраваць тое, што зроблена намі за гэты год на невялікім адрэзку мастацка-музычнай дзейнасці —у Беларускім ансамблі песні і пляскі у Беластоку, кіраўніком якога я з'яўляюся.

Ансамбль паспяхова працуе з лютага гэтага года. Да 1 верасня ансамблем дадзена сто канцэртаў, праграму якіх складаюць песні совецкіх кампазітараў, рускія, польскія і украінскія народныя песні і пляскі.

У складзе ансамбля—маладыя таленавітыя сілы, вышаўшыя з самадзейнасці горада і вёскі.

Ансамбль з надзвычайнай радасцю і ўздымам дае шэфскія канцэрты ў падраздзяленнях Чырвонай Арміі, атрымліваючы ад камандавання пахвальныя водгукі і падзякі.

На долю ансамбля выпаў гонар ужо на чацвертым месяцы існавання выступаць у сталіцы БССР—Мінску на XVIII з'ездзе комуністычнай партыі і перад пісьменнікамі. У часе выбарчай кампаніі ў Вярхоўныя Советы СССР і БССР ансамбль абслужыў выбаршчыкаў Беластоцкай вобласці, Ліды, Брэста, пагранічча і курорт Друскенікі.

Гледачом ансамбль сустракаецца заўсёды вельмі прыхільна і горача.

Прыемна было бачыць, напрыклад, такія ўзрушаючыя абразкі ў Друскеніках, калі грамадзяне Літоўскай рэспублікі, пасеўшы на беразе Нёмана, слухалі нашы песні, білі «брава» на тым баку, не звяртаючы ўвагі на сваіх пагранічнікаў. Гэта было перад далучэннем Літвы да Совецкага Саюза.

Уважлівыя адносіны да нашай працы надаюць усяму калектыву бадзёрасць, энергію і ўпэўненасць у свае маладыя сілы.

Цяпер ансамбль рыхтуецца да паездкі па Совецкаму Саюзу, працуе над новымі песнямі совецкіх кампазітараў, папаўняе праграму ўрыўкамі з беларускіх опер.

Усе ўдзельнікі ансамбля гараць адным жаданнем—быць як найбольш карыснымі для сваёй краіны, для свайго совецкага народа.

Прада мною, як мастацкім кіраўніком ансамбля, стаяць зараз вялікія задачы: прадоўжыць збіранне фальклору, сістэматызіраваць і ўпарадкаваць ужо сабраны і, нарэшце, прыступіць да літаратурнай працы, для якой за годы няволі накоплена шмат назіранняў і фактычнага матэрыялу. Хочацца ўсе сілы аддаць на карысць сваёй вялікай радзімы, для справы вялікай партыі Леніна—Сталіна, якая вывела нас з душных скляпенняў сярэднявечнага феадалізма і клерыкалізма на свабодную зямлю.

Р. ШЫРМА.
Мастацкі кіраўнік ансамбля песні і пляскі Беластоцкай філармоніі.

АЖЫЦЦЯЎЛЕННЕ МАРЫ

Прыблізна год назад я ўпершыню ўступіў на совецкую зямлю. Я дасюль не магу забыць таго ўражання, якое ўтварыла на мяне маё першае знаёмства з Беластокам, дзе дзесяткі мастакоў, скульптараў і дэкаратараў, маіх таварышоў, упарта і нястомна працавалі над упрыгожаннем горада.

Хутка і я быў захоплен нябачанай па сваёй сіле і заразіцельнасці хваляй творчага энтузіязма. Я пачаў разумець, што інакш і не магло быць, што ў краіне, якая мае магутнейшага абаронцу — непераможную Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію, у краіне, якою кіруюць мудрыя правадыры, здолеўшыя затрымаць полымя вайны ля самага парога нашай радзімы, што ў такой краіне радасць і шчасце людзей — натуральная і звычайная з'ява.

Мне захацелася далучыць свой голас да агульнай сімфоніі вызваленай творчасці. Разам з іншымі таварышамі я прыступіў да дэкарыравання беластоцкага Дома Чырвонай Арміі барэльефамі нашых правадыроў. У гэты час была атрымана прапанова мінскіх мастакоў прыняць удзел у падрыхтоўцы мастацкай выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці».

Следуючы свайму глыбока ўсвядомленаму творчаму жаданню, ажыццяўляючы адну з заветнейшых сваіх мараў, я прыступіў к рабоце над скульптурай таварыша Сталіна. Над гэтай работай я працую пяць месяцаў і кожны раз, калі я падыходжу да станка, я перажываю тыя ж пачуцці, што і ў першы дзень, калі я ўпершыню прыступіў да работы над скульптурай. Колькі-б новых рысаў я не адшукваў у фігуры, у поглядзе таварыша Сталіна, я адчуваю, што ўсяго гэтага мала для таго, каб перадаць веліч, мудрасць і бацькоўскую любоў нашага дарагога правадыра к народу.

Мая мара — глыбока авалодаць совецкай тэматыкай, стаць поўнацэнным тварцом вялікага соцыялістычнага мастацтва.

З. МЕССЕР.

ШТО ДАЎ ГОД

Права на свабодную, натхнёную творчасць здабылі мы на совецкай зямлі.

Што даў год? Не ганяючыся за гучнымі фразамі, можна сказаць, што на гэта пытанне лепш за ўсё адказалі-б успаміны аб тым, як жылося, як дыхалася **да** і **пасля** даты, якую мы зараз урачыста святкуем.

За кароткі час з моманту нашага выезду з Вільні ў кастрычніку 1939 года і да дня XXII гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі намі, групай яўрэйскіх актораў, упершыню была пастаўлена совецкая п'еса. З гэтага пачалася арганізацыя Дзяржаўнага яўрэйскага драмтэатра ў Беластоку. У далейшым тэатр паставіў п'есы Шолам-Алэйхема і Шэкспіра. Цяпер тэатр працуе над рэволюцыйнай эпапеяй і зноў над яўрэйскай класікай.

У Польшчы былі яўрэйскія акторы— не мала добрых, былі і яўрэйскія спектаклі, але яўрэйскага тэатра не было. І першы год вызвалення даў яўрэйскаму тэатру цвёрдую глебу для плённага творчага развіцця. Гэта глеба, гэта вера ў заўтрашні дзень ёсць вялікі дар совецкай радзімы нам, вызваленым ад вечнага гора і нястач творчым работнікам.

Што даў год? Свабоду працаваць і тварыць! Веру ў перамогу над усімі цяжкасцямі. Ясны, сонечны шлях творчых поспехаў.

А. МАРЭЎСКІ.
Рэжысёр Беластоцкага дзяржаўнага яўрэйскага тэатра.

Іосіф Акрутны

АД СЭРЦА

Верасень 1939 года. Польская ўяўная магутнасць ужо ляжала ў руінах. Краіна пала на працягу некалькіх дзён.

У гэтыя грозныя дні я ратаваўся з абрыдлага роднага горада ў карэце Чырвонага Крыжа. Боль знішчэння і мары аб блізкім шчасці ўзвіхрылі маё сціснутае сэрца. Нечуваны імпэт імчаў мяне па доўгаму, нясвойскаму шляху. Пакалечанае ўчора і грознае сягоння зрабіла больш лёгкім і прывабным маё адзінокае існаванне. Раптоўна я адчуў у сабе старадаўні смутак, які пад попелам гарэў у маёй свядомасці: краіна Леніна і Сталіна вызваліць мяне ад усіх маіх, тваіх і нашых пакут. Ад продкаў наследаваны боль выгруіцца і ператворыцца ў сонечную радасць.

Сэрца мяне не абманула: светлая ўсмешка ў позірку чырвонаармейца вітала мяне на вызваленай, совецкай зямлі.

«Таварыш!»

Якая гэта ўзнагарода за годы смутку па чалавечаму слову з боку ўлады! Сэрца ледзь не выскачыла ад нібы незаслужанага шчасця.

У мяне хутка знікла раздвоенасць пачуцця: сум па радзімых кутках там, на тым баку, і радасць, якая агарнула цябе тут, як полымем. Цябе ўскалыхнула шчасце нованароджанага, які не ведае двоістасці. Нованароджаны ведае толькі святло і сонца. Разуменне чорнай ночы і светлага дня не ўваходзіць у арбіту яго пачуццяў і думак. Я нованароджаны, 17 верасня 1939 года пачатак майго другога маленства. Новае жыццё, новы свет адкрыліся майму воку, маім думкам.

Салдацкі мундзір мяне заўсёды палохаў. Салдатчына была заўсёды сінонімам грубасці і лютасці для маіх родных. Чырвонаармеец, хоць стомлены і запылены, увайшоў у мой новы свет шчырым вартавым маіх, тваіх і ўсіх нашых рубяжоў любімай і дарагой радзімы. У гераічным чырвоным байцу я знайшоў свайго роднага брата, у школе, на фабрыках і заводах, на чыгунцы я знайшоў вялікі сэнс жыцця.

17 верасня 1939 года падарыла мне мой уласны свет.

Слава табе, брат чырвонаармеец!

Сёння на Нёмане

Польскія географы называлі Стаўбцы «краем Еўропы». Гэта пісалі з бессаромнай нагласцю. Дзецям у школах, дарослым па радыё ўнушалася, што «за Стаўбцамі канчаецца Еўропа».

17 верасня 1939 года... Стаўбцы... Толькі-што па вуліцах правінцыяльнага гарадка, узнесенага хлуслівымі польскімі географамі ў ранг «еўрапейскага горада», прайшла чырвоная пяхота. Байцы з жывой цікаўнасцю аглядаюць дамы, вуліцы. Уся прыгажосць горада—у касцёлах, сінагогах, цэрквах.

—Ці ёсць у вас кіно?—пытаюцца яны ў мясцовага жыхара.

—Кіно няма.

—А клуб?

—І клуба няма.

—А школ многа?

—Адна гімназія.

— А газета ў вас выходзіць?

—Не, сваёй газеты не маем.

Глухая, закінутая правінцыя, аб якой мы даўно забыліся.

За 30 вёрст ад Стаўбцоў—у совецкім Дзяржынску—ёсць і клуб, і свая раённая газета, і свой тэатр, які ставіць Астроўскага, і цудоўнае кіно, новыя магазіны, школы-дзесяцігодкі.

Паўз самыя Стаўбцы працякае прыгажун Нёман. Ён бярэ пачатак у калгаснай Уздзеншчыне (Мінскай вобласці). З якой прагнасцю глядзелі нёманскія рыбакі на родную раку, нецярпліва чакаючы той мінуты, калі на іх левым беразе жыццё стане такім-жа свабодным, як і на правым, совецкім беразе.

У цудоўны дзень 17 верасня заветныя мары нёманскіх рыбакоў здзейсніліся. Шырокі Нёман, апеты Якубам Коласам, стаў у гэты дзень свабодным і на левым беразе.

Мінуў год свабоднага жыцця. Няма больш правінцыяльнага адбітку на Стаўбцах. Гэты прынёманскі горад стаў непазнавальным. Афіцэрскі клуб «На рэдуце», раней даступны толькі лічаным сем'ям, зрабіўся цяпер цэнтрам глыбоказмястоўнай масавай работы сярод усяго працоўнага насельніцтва. Больш 30 совецкіх карцін прайшлі на экране гэтага клуба за год і іх глядзелі тысячы працоўных. Карціну «Шчорс» глядзеў стаўбцоўскі чыгуначнік Шчорс, стрыечны брат героя. Ён пазнаў на экране блізкія рысы дарагога чалавека, чыё імя цяпер носіць адна з вуліц у Стаўбцах (бацька Нікалая Шчорса родам з гэтага горада).

Скасавалі базарную плошчу і на месцы яе, паблізу Нёмана, разбілі цудоўны бульвар, у цэнтры якога будзе пастаўлен помнік Ільічу. Замест адной гімназіі—у горадзе некалькі сярэдніх і няпоўных школ. А ўлетку ў Стаўбцах здарылася незвычайнае. З навакольных вёсак панаехалі хлопцы, дзяўчаты на настаўніцкія курсы. Стаўбцы пачалі рыхтаваць настаўнікаў.

— Што вы скончылі?

— Стаўбцоўскія настаўніцкія курсы. Усё-ж гэта здорава гучыць!

— А што вы чытаеце?

— Як што? Стаўбцоўскую гарадскую газету. Вось ужо год, як яна выходзіць. Гарадская бібліятэка. Поўгода ўжо як існуе яна! Нарэшце, мы атрымалі магчымасць чытаць кнігі свайго славутага земляка Якуба Коласа!

На Нёмане, паблізу Стаўбцоў, ёсць вёска Мікалаеўшчына—гэта радзіма Якуба Коласа. І ў Мікалаеўшчыне па-другому пайшло жыццё. Беднякі—усе да аднаго—атрымалі зямлю, цяпер у вёсцы кіпіць новае будаўніцтва. А ў самым цэнтры вёскі будуюць двухпавярховую школу, якой сяляне з поўным абгрунтаваннем просяць прысвоіць імя свайго славутага аднавяскоўца, лепшага песняра Совецкай Беларусі—Якуба Коласа.

За гэты год і на левым беразе Нёмана шырокімі пpасторамі леглі калгасныя землі. Калгасы ў Стаўбцоўскім раёне,—праўда, маладыя па стажу,—дасягнулі многага. Нядаўна давалі аванс на працадні—першыя ў жыцці працадні, зробленыя былымі батракамі і беднякамі. Атрыман толькі аванс, але і ён выліўся ў добрыя дзесяткі пудоў буйнага зерня.

Зямлі навакол Стаўбцоў шмат, добрай прынёманскай зямлі, але гаспадароў у яе было мала. Лепшай зямлёй валодалі тры браты Крупскіх. Вось ужо год, як народ адабраў у іх багацце, нажытае чужой працай, і сам завалодаў ураджайнай зямлёй. У доме Крупскіх пасяліліся батракі.

Чырвонаармейцаў, якія першымі 17 верасня мінулага года ўвайшлі ў Стаўбцы, здзівіла безліч зададзеных ім пытанняў:

— А скажыце, ці праўда, што ў Маскве, Мінску, Харкаве, Одэсе няма ніводнага беспрацоўнага?

— Гэта безумоўная праўда,—адказвалі чырвонаармейцы.

— А ў нас у адных Стаўбцах—тысяча беспрацоўных...

І сапраўды, амаль трэцяя частка насельніцтва Стаўбцоў не мела сталай работы. Людзі рыбачылі на Нёмане, але за гэта трэба было плаціць вялікія падаткі. Улетку з горада ішлі батрачыць у вёску, але і гэта быў не сталы заработак, яго, вядома, нехапала. А цяпер у стаўбцоўскай газеце з дня ў дзень патрабаванні на рабочую сілу,—аб беспрацоўі тут забыліся.

Стала лёгка дыхаць, разагнуліся спіны, пачалося цудоўнае творчае жыццё. Аб ім цяпер радасна і шчасліва пяюць на берагах свабоднага Нёмана.

Еф. САДОЎСКІ.

Ф. Пестрак

АРМІЯ ЧЫРВОНАЯ

На шляхі зялёныя
Ішла непераможная
Армія Чырвоная
Путы рваць вяльможныя.

Удаль шумелі сцягамі
Песні праменістыя,
Роднымі прасцягамі
Ехалі танкісты.

Цераз бары шумныя,
Рубяжы крывавыя
Слала многадумныя
Весткі воля слаўная.

Беларусь Заходняя
Расцвіла праменнямі,
Беларусь народная
Зашумела песнямі.

Сілы накіпеўшыя,
Сілы гартаваныя
Паліліся песнямі,
Воляй раскаванымі.

Бацька прыгаруннены
Усміхнуўся сонечна
І маршчыны сумныя
Прамянелі горача.

А слязамі радасці
Маці абрасілася,
І ў забітай старасці
Сэрца маладзілася.

А дзяўчына любая,
Прыгажуня спеўная,
Ішла вясельнай дружбаю,
Птушкай перапеўнаю.

А хлапцы адважныя
Ішлі атрадам з песнямі —
Усе віталі радужна
Армію прадвесную.

Бо астрогі панскія,
Путы нам кайданныя —
Усё разбіла брацкая
Армія жаданая.

Помні, брат вызвалены,
Верасень семнаццаты —
Быў ты абяздолены,
Стаў ты найбагацейшы.

Дык красуй, прыгожая
Армія Чырвоная, —
Ты непераможная
Армія народная.

Гродня, 1940.

Натхняюць клопаты партыі

Народ вольна і шчасліва спявае песні радасці... Дзякуючы вялікай увазе партыі і ўрада здабыты выдатныя поспехі ў развіцці мастацтваў у заходніх абласцях БССР. Аб гэтым сведчыць работа ўсіх творчых калектываў мастацтваў, у тым ліку і нашага ансамбля песні і пляскі пры Беластоцкай філармоніі. У ансамблі творча вырасла група здольных танцораў, прышоўшых з мастацкай самадзейнасці, сярод іх асабліва заслугоўваюць быць адзначанымі М. Давідовіч, С. Кузьміч, В. Тур, Т. Грыгор'ева, Л. Макарук і С. Мірковіч.

За час сваёй працы, мы, не лічачы нашых канцэртных гастролей (пастаўлена больш сотні канцэртаў), паставілі дзесяць народных танцаў. Сярод іх беларускія «Лявоніха» і «Юрачка» (з удзелам хора), «Чарот», «Падушачкі», «Круцёлкі», «Качан» і «Каза» (дуэт); польскія «Обэрак» і «Траяк» (з удзелам хора); літоўскія «Сукцыніс».

У далейшым вызначана пастаноўка беларускіх, украінскіх і польскіх танцаў: «Бульба», «Нарэчанька» (папулярныя сярод насельніцтва заходніх абласцей), «Гапак», «Запарожац», «Куявяк» і «Збуйніцкі».

На новыя творчыя поспехі нас натхняюць бацькоўскія клопаты партыі Леніна — Сталіна аб развіцці мастацтваў вызваленага народа.

І. ХВОРАСТ.
Балетмейстар ансамбля песні і пляскі Беластоцкай філармоніі.

Поспехі і планы

Актыўная творчая работа мастакоў Беластока пачалася хутка пасля ўступлення Чырвонай Арміі ў Беласток. Партыя і ўрад стварылі ўсе ўмовы для плённай творчасці мастакоў.

Многія мастакі Беластока заключылі дагаворы на работы да надыходзячай выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці».

Нароўні з іншымі таварышамі прымала я ўдзел у абласной выстаўцы, для якой напісала карціну, паказваючую «Дом жабракоў» у невялікім заходне-украінскім гарадку на беразе ракі Сан. Увесну ўзялася за выкананне эскізаў на тэму «Пейзаж сучаснага Беластока» да надыходзячай кастрычніцкай выстаўкі. Адну карціну скончыла, другую канчаю.

Адначасова з творчай работай прымаю актыўны ўдзел у жыцці Саюза мастакоў, у яго культурнай і палітычнай рабоце.

У бліжэйшы час маю намер рабіць зарысоўкі пейзажаў горада Гродні, каб сабраць матэрыял для творчай работы ў зімовы час. Апрача таго, жадаючы бліжэй азнаёміцца з жыццём рабочых, збіраюся зрабіць цыкл зарысовак на фабрыках, каб з часам выкарыстаць іх для карцін.

Апрача ўсяго, у адкрываемай рысавальнай школе буду працаваць у якасці педагога.

С. ЦЭНТНЕРШВЕР.

ПОЛЬСКІЯ СОВЕЦКІЯ ПІСЬМЕННІКІ Ў МІНСКУ

Гэтымі днямі ў Мінск, па запрашэнню Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР, прыехала група польскіх совецкіх пісьменнікаў: дзіцячая пісьменніца Яніна Бранеўская, маладая паэтэса Валенціна Найдус, празаікі Канстанцін Ансельм і Ганна Дабжынская, малады паэт Тэафіль Главацкі. У часе свайго прабывання ў Мінску польскія пісьменнікі азнаёмяцца з гаспадарчымі і культурнымі дасягненнямі сталіцы ордэнаноснай Беларусі, наведаюць буйнейшыя прадпрыемствы горада, прагледзяць лепшыя пастаноўкі беларускіх тэатраў.

10 верасня польскія совецкія пісьменнікі наведалі Дзяржаўнае выдавецтва пры СНК БССР, дзе мелі гутарку з галоўным рэдактарам мастацкай літаратуры тав. Казюком. Пісьменнікі расказалі аб сваёй творчай рабоце.

Гадавіну вызвалення Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны польскія совецкія пісьменнікі адзначаюць небывалай творчай актыўнасцю. За кароткі, параўнаўча, час польскія пісьменнікі стварылі рад новых твораў. Яніна Бранеўская закончыла работу над аповесцю «Вандроўкі меднага грошыка», у якой паказана жыццё працоўных у панскай Польшчы. Аповесць перакладзена на беларускую і рускую мовы і друкуецца асобным выданнем у Дзяржаўным выдавецтве БССР і ў комсамольскай газеце «Сталинская молодежь».

Пісьменніца Елена Сэльм здала выдавецтву кнігу апавяданняў і нарысаў «Дзень учарашні» і працуе над кнігай «Я, ты і ўвесь свет». Рад навел з жыцця гарадской беднаты ў панскай Польшчы напісала Ганна Дабжынская, адна з іх — «Яблыкі і лялька» была надрукавана ў нашай газеце. Паэтэса Валенціна Найдус напісала рад вершаў аб рэвалюцыйнай барацьбе польскага пралетарыята, аб радасці і шчасці вызваленага народа. Над новымі творамі аб совецкай рэчаіснасці працуюць пісьменнікі К. Ансельм, Юрый Равіч, Г. Главацкі і іншыя.

Дзяржаўнае выдавецтва БССР выдае ў гэтым годзе як творы польскіх совецкіх пісьменнікаў, так і творы класікаў польскай літаратуры — Адама Міцкевіча і і інш. Да надыходзячага 85-годдзя з дня смерці Міцкевіча (канец лістапада) будуць надрукаваны творы вялікага паэта ў перакладзе на беларускую мову.

Вера ў жыццё

Ёсць нешта цёплае, падкупляючае ў гэтых вершах.

Зусім яшчэ маладая. Ніна Тарас на сабе адчула ўсе пакуты жыцця на «ўсходніх крэсах» былой панскай Польшчы, увесь жах быць маладым і не мець работы, не мець права на жыццё.

Ніна Тарас прынесла ў сваіх вершах матывы адчаю, глыбокага гора, адчуванне бездапаможнасці і разгубленасці ў свеце капіталістычнай няпраўды.

Многа, ах, многа без хлеба людзей,
Голад бязлітасна ў вочы глядзіць.
Таму і песня, ўзляцеўшы з грудзей,
Сумна сягоння для нас зазвініць.
(«Хоць мая песня...», 1937).

Гэтыя матывы праходзяць праз усю кнігу. Яны ствараюць настрой большасці вершаў, напісаных да верасня 1939 года.

Вершы аб беспрацоўных, вобразы тых, хто «плёўся ў гразкія прасторы, між бярозаў сонных маладосць губляў» (стар. 35), думкі аб марна гінучых маладых сілах асабліва выразна гучаць у творчасці Ніны Тарас.

З яе вершаў наша моладзь можа даведацца аб маладых людзях, што гадамі марылі аб тым, каб каму-небудзь прадаць свае рукі, свае здольнасці, бо адна толькі работа магла-б вярнуць ім адчуванне чалавечай гордасці.

Сілы шмат ў руках я маю,
А дастану мо' работу,
І у нашым нават краі,
Будзе жыць табе ахвота.
За кусок з мякінай хлеба
Ласкі іх прасіць не будзем!
Маці, плакаць больш не трэба,
Надрываць старыя грудзі.

Прыведзеныя радкі ўзяты намі з верша «На новы год» (1937), у якім расказана аб «навагодніх» надзеях бедняка-беларуса — аб рабоце, аб незалежнасці ад багатых дабрадзеяў.

Ёсць у Ніны Тарас верш «Вясна» (1937). Бядняк-селянін сустракае вясну. Вось ён ходзіць за баразною. Яму —

Можа не цяжка, а неяк спіна
Гнулася крукам.

Дома аратая чакае сям'я, дзеці. Яны паселі за стол, а —

Маці на пальцах худых да жніва
Лічыць нядзелі.

Маці, дзеці галодныя. Яны будуць галадаць аж да новага ўраджаю, і ўсё-ж ім не сумна:

Бо трэла сонца ў вокны ясней,
Лепш, як учора.

Вось і ўсё. Але-ж гэты верш запамінаецца сваёй праўдзівасцю, сцісласцю, лаканічнасцю паэтычных фармуліровак.

Ніна Тарас —лірык. Свае настроі яна часта раскрывае праз асобныя з'явы прыроды, пейзажныя зарысоўкі. Часцей за ўсё ў яе вершах, напісаных да вызвалення Заходняй Беларусі, сустракаюцца сумныя фарбы дажджлівай восені, халоднай зімы.

Ночкаю зоры ў небе тапіліся.
Ў небе балоцістым, мокрым і гразкім.
А у апаўшым і стоптаным лісці
Восень балады складала і казкі.
(«Ночкаю зоры...», 1936).

«Хутка дзень заплюшчыў змораныя вочы, змрок густыя цені па бруку раскінуў, дождж сцюдзёна шыбы, звонячы, палошча, гасіць на прадмесці ліхтары, вітрыны» («На бруку», 1937). «Ужо зіма. І, ветрам гнаныя, далёка хмары адплылі, — мне сцішца зноў дарога знаная праз межы, вузкія палі» («Ужо зіма», 1937). «І расцвітала ў далінах Палесся лёгкатуманная жоўтая восень. Чула ў дубраве я сумную песню, раз толькі, болей пачуць не прышлося» («І расцвітала...», 1937).

Прыгнечаны народ марыў. Ён жадаў шчасця, волі. І гэтыя надзеі таксама афармляюцца ў паэтэсы ў прыгожыя сонечныя пейзажы.

У палях захвалююцца нівы,
Сонца косы скупае у іх,
І пакоцяцца ўдаль пералівы
Ціхазвонных лугоў веснавых.
А па чорнага неба разорах,
У туманнай начной цемнаце
Узыйдзе ранні палаючы золак,
Залатою зарой зацвіце.
(«Яшчэ веру», 1936).

У апісанні прыроды паэтэса дасягае часамі вялікай непасрэднасці, цеплыні. Хочацца прывесці яшчэ адну вытрымку з верша «Калыханка» (1937):

Ужо не ходзіць вецер па вуліцы,
Не калышыцца ў лузе трава.
Цішыня пад страхою зноў туліцца,
Спі, сынок, ой люлі, а-а-а!
Толькі цені паўзуць каляінамі,
Задрамала у лесе сава,
А ты спі, затулі вочкі сінія,
Ой люлі, ой люлі, а-а-а!

Ніна Тарас—«ціхая» паэтэса. Яна ўнікае гучных слоў і гаворыць нібы ўпоўголаса. Яе палітра ведае толькі напоўпрытушаныя, спакойныя фарбы. Часта яна ўводзіць у свой верш прыгожую, каляровую арнаментоўку народнага вершаскладу, праяўляючы пры гэтым творчую самастойнасць, паэтычны такт («На ўсход ідучы...», «За кудзеляй», «Ой, у полі...» і інш.).

Зараз Ніна Тарас пяе новыя песні— песні аб вялікай социялістычнай радзіме. Паэтэса прагне імкнецца ўвабраць у сябе ўражанні новага жыцця нашай неабсяжнай краіны.

Н. ЛЕВІН.

Ніна Тарас. «На ўсход ідучы...» Вершы. Мінск, 1940

Радасна працаваць

Успамінаецца верасень мінулага года. Беласток кіпіць радасцю — прышла Чырвоная Армія! Святочны настрой у людзей... Узнікла думка напісаць карціну аб прыходзе Чырвонай Арміі. Атрымаў працу па ўпрыгожванню горада. Пачаўся новы перыяд майго творчага жыцця.

Прайшлі месяцы. І зараз, напярэдадні, гадавіны вызвалення, я заканчваю кампазіцыю «Уваход чырвоных казакаў у Беласток». Успамінаю нядаўняе, урачысты настрой працоўных Беластока, сустракаўшых чырвонаармейцаў, і імкнуся паказаць гэта на палатне. Аднаачасова думаю аб новых творах, раблю для іх эскізы. Пад ясным сонцам совецкай краіны лёгка і радасна працаваць.

Бернард РАЛЬНІЦКІ.



По заходніх абласцях БССР. На здымку: Від на «Плошчу Свабоды» ў гор. Брэсце. Фота В. Лупейкі (БЕЛТА).

М. Машара

ХОДЗІЦЬ РАДАСЦЬ ПА ВЁСКАХ

Зашумела жыццё у краіне,
У краіне, дзе здзекі цвілі,
Дзе гарчэй палына і рабіны
Нашы шэрыя будні брылі.

Зазвінелі цымбалы вясёла,
Запяяла і скрыпка і медзь,
Ходзіць радасць па вёсках і сёлах,
Працаваць і змагацца завець.

Гэта радасць з усходніх ваколіц,
З тых, дзе шчасце раскута даўно.

Гэту радасць прывёз комсамолец —
Памагаць будаваць нам жыццё.

Ажылі нашы шэрыя хаты
Маладым і вясёлым жыццём.
Не прыедзе больш гора у сваты,
З кіем войт не стаіць пад акном.

Мы будуем дарогі і школы,
Большавіцкі здабудзем размах.
І нідзе і ніколі чырвоны
З рук не выпусцім сталінскі сцяг.

Шаркаўшчына, Віленская вобласць, 1940 г.

З ФАЛЬКЛОРНЫХ ЗАПІСАЎ

БОТЫ ПАНА МАСЦІЦКАГА

Ні з таго, ні з сяго—бац—прышла ў Давід-Гарадоцкі магістрат важная папера: «Выдзеліце сярод простага люду самага добрага шаўца і як найхутчэй прывязіце ў Варшаву».

— Што за праява?—думаюць у магістраце, але-ж не паслухацца нельга. Выдзелілі шаўца. А найлепшы ў нас майстар Дубок: за дзень дзве пары ботаў зробіць, як лялькі тыя. Яго і паслалі.

Паехаў. А праз тыдзень назад вярнуўся. Пытаюцца шаўцы:

— Ну, што?

— А вось што, — расказвае. —Прывезлі мяне ў Варшаву. Толькі гэта на вакзал выходзім, а нейкі пан мяне ўжо ў машыну садзіць. Пасадзіў і вязе — куды-б вы думалі? — у лазню мыцца. Памыўся я, а ён мяне ў найлепшы магазін вязе. Даюць мне без грошай касцюм — на першы сорт, ды яшчэ парфумай дзьмухаюць. Гэта каб з мяне шавецкі пах вытруціць. І зноў у машыну садзяць і прывозяць мяне ў нейкі палац. А ў палацы тым што ні крок — то князь, то генерал, проста вольнага месца няма. Мяне вядуць усё далей і далей, да яшчэ большага пана.

«Ну, думаю, Дубок, прапаў ты цяпер, жывы адсюль не выбярэшся». Але іду.

Прывялі, мяне, нарэшце, у самы багаты пакой і ўпусцілі ў дзверы. Стаў я. Стаю і вачыма лыпаю: бачу перад сабою — каго-б вы думалі—самога пана Масціцкага!—па карціны яго пазнаў.

Пан прэзідэнт мне тут і кажа:

— Ну, пане шаўцу, пазваў я цябе, каб пашыў ты мне боты. Здымай,—кажа, — мерку і каб заўтра боты былі тут.

Дзіўна мне, прызнацца, каб гэта пану Масціцкаму ды ў Варшаве ботаў бракавала, але мерку здымаю.

— Што-ж,—кажу, — пан, давай твае ногі сюды, давай —кажу,—пятку, а цяпер,—кажу,—пад'ём памераем.

Пасадзілі мяне ў асобным пакоі. Шыю боты! Гатунак—найпершы, боты лёгкія, як пяро! Не ісці ў іх, а бегчы можна без ніякага націску.

Пашыць боты—пашыў, а аддаць... не аддаў. Як скончыў працу, дык пасадзілі мяне зноў у машыну, касцюм знялі, а ў лазню ўжо не вазілі, — відаць, ад пана прэзідэнта можна і не мыўшыся ехаць. Праўда, пару злотых на дарогу-ткі далі, але і ўсё...

Ну, а праз колькі часу збег пан Масціцкі. У маіх ботах збег! І лёгка, відаць, было яму бегчы, бо зрабіў я яму боты, што пух, ды яшчэ з музыкай...

Запісана ад І. С. Германа (45 год) у Давід-Гарадку Пінскай вобласці.

„ВАЯКІ“

Калі ішла Чырвоная Армія, дык польскія афіцэры, нібы тыя мышы, параз бягаліся. Але адзін, самы заядлы, яшчэ крычыць:

—Страляйце, і ўсё тут.

Ну, мы страляць не хочам. Тым часам глядзім на афіцэра, аж-но і сам ён не страляе.

Надышлі чырвоныя. Паляцелі самалёты, быццам птушкі ў вырай. Акружылі чырвонаармейцы нас і афіцэраў, у палон забралі. Мы тады і пытаемся ў свайго афіцэра:

—Што-ж ты, пане капітане, нам загадваў, а сам не страляў?

Афіцэр хоць і скрывіўся на нашыя словы, але адказвае:

—Дзе тут страляць, калі няма куды ўцякаць...

А потым падумаў і кажа:

—Праклятыя яно ўсё пропадам! Калі ў Саветаў столькі самалётаў, што каб ім усім сесці, дык цэлай Польшчы не хопіць.

Запісана ад калгасніка Н. П. Патрубейкі (30 год) у в. Туры Давід-Гарадоцкага раёна Пінскай вобласці).

(З матэрыялаў Інстытута гісторыі і этнаграфіі АН БССР).

МАСТАЦКАЯ САМАДЗЕЙНАСЦЬ БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ

Новымі творчымі поспехамі адзначаць усенароднае свята — гадавіну вызвалення Заходняй Беларусі з-пад панскага іга — калектывы мастацкай самадзейнасці Брэсцкай вобласці. Гурткі мастацкай самадзейнасці пры дамах соцыялістычнай культуры, хатах-чытальнях рыхтуюць спецыяльныя канцэрты. Калектыў самадзейнасці брэсцкай швейнай фабрыкі рыхтуе рад песень аб Сталіне, Варашылаве, Чырвонай Арміі, а таксама пастаноўку п'есы «Месія», шмат музыкальных і танцавальных нумароў. Вялікую і разнастайную праграму рыхтуюць тэатральныя калектывы сувязістаў, рабочых друкарні імя Варашылава, клуба работнікаў дзяржгандлю і другія.

Гурток мастацкай самадзейнасці уплінскага сельскага дома соцыялістычнай культуры (Пружанскі раён) рыхтуе да свята п'есу «Залатыя рукі» і рад песень аб правадыру народаў таварышу Сталіне, аб вызваліцельніцы — Чырвонай Арміі, а таксама рад народных беларускіх і рускіх песень і танцаў.

Цікавы канцэрт рыхтуе ансамбль Белавежскага дзяржаўнага запаведніка. Калектыў мастацкай самадзейнасці саматужных арцелей горада Пружаны паставіў п'есу «У тыя дні» Рэзніка. Драмгурток ружанскага дома соцыялістычнай культуры рыхтуе пастаноўку «Партызанаў» Крапівы, якую мяркуе паказаць у сваім раёне і ў абласным цэнтры — Брэсце.

Мастакі вобласці пішуць да свята рад цікавых карцін. Абласны Дом народнай творчасці 20 верасня адкрывае выстаўку мастацкай самадзейнасці. Дом народнай творчасці атрымаў ужо ад мастакоў-самавучак 38 карцін. Селянін вёскі Царкоўнікі Камянецкага раёна В. К. Шчыкін прыслаў 8 напісаных ім карцін. Сярод іх карціны, якія паказваюць новае жыццё ў калгасе: «Калгаснікі на адпачынку», «Чытка газет у калгасе», «Ворыва ў калгасе». Урач белавежскай амбулаторыі В. А. Власаў прыслаў 9 эцюдаў: «Восень», «Зіма», «Вечар» і інш. Рабочы-чыгуначнік з Кобрынскага раёна Н. С. Лукашук прыслаў некалькі ўзораў разьбы па дрэву, у тым ліку барэльефы «Ленін і Сталін» і «Варашылаў». Зараз тав. Власаў рыхтуе кампазіцыю па дрэву «Разгром белапольскіх акупантаў у 1920 годзе». Альфрэд Рыль з мястэчка Дамачова прыслаў некалькі карыкатур. Вельмі добра выканана карыкатура «Прагульшчык». Былы палітзняволены тав. Рудчык піша карціны «Арышт дэманстрантаў у вёсцы пры ўладзе польскіх паноў» і «Сустрэча Чырвонай Арміі працоўнымі Заходняй Беларусі».

І. МУРАВІЦКІ.

Б. МАРК

Яніна Бранеўская

Літаратура для дзяцей у капіталістычна-памешчыцкай Польшчы была ў сваёй большасці прасякнута богабаязным і шавіністычным духам. Кніжны рынак і школьныя бібліятэкі былі запоўнены кніжкамі аб Пілсудскім і Рыдз-Сміглым, аб «перамогах» польскай шаблі ў 1920 годзе.

Кніжкі гэтыя былі насычаны пагардай да «русінаў» (украінцаў і беларусаў), нянавісцю да «халатнікаў» (яўрэяў). Нават такія таленавітыя пісьменнікі, як Герліна Наглерава альбо Шэльбург-Зарэмба прамянялі свой талент на залатое руно і выпускалі шавіністычную атруту для дзяцей і моладзі, якая калечыла іх душы.

Сярод моладзі пашыраліся розныя «пар-награфічныя» аповесці і ультра-сантыментальныя раманы, якія выдаваліся цёмнымі прайдзісветамі альбо арцыбіскупскім выдавецтвам святога Войцэха.

Розныя шарлатаны ад пяра, накшталт Марка Даманскага альбо Антона Марчынскага, кідалі польскіх дзяцей і польскую моладзь у свет духаў, чарцей,—у свет, дзе крымінальны злачынец увенчваўся лаўрамі героя, а разбой і гвалт узнімаўся да «вышынь» містыкі.

Аднак, прагрэсіўная частка настаўніцтва і лепшая частка вучняў шукала сапраўднай кнігі, сапраўднай літаратуры. З якім захапленнем чыталі яны пераклады Чукоўскага! Якую радасць, якое шчасце запаляў у сэрцах дзяцей і настаўнікаў вядомы нумар штогодніка для дзяцей «Прамень», прысвечаны жыццю дзяцей у Совецкім Саюзе. Нумар гэты быў, вядома, канфіскаваны, а супрацоўнікаў журнала Ванду Васілеўскую і Яніну Бранеўскую рэакцыя пачала шалёна цкаваць.

У такіх умовах пісала Яніна Бранеўская, адна з нешматлікіх прагрэсіўных польскіх пісьменніц. З пачатку сваёй творчай работы Яніна Бранеўская выступіла супроць свету фальшы, маны, супроць расквітнеўшага сантыменталізма, богабойнасці і шавінізма, панаваўшых у афіцыйнай літаратуры для дзяцей.

Ужо ў першай сваёй кніжцы «Гісторыя тачонага дзеда і маляванай бабкі» (1934 год) Бранеўская робіць моцны акцэнт на соцыяльных момантах жыцця, і гэта асаблівасць застаецца характэрнай для ўсёй яе пазнейшай творчасці.

Творы Бранеўскай вызначаюцца цікавай ідэяй, цікавым зместам, а таксама матывамі, узятымі з непасрэднага кантакту з дзецьмі,—кантакту не толькі мацярынскага, але і настаўніцкага. Гарманічнае спалучэнне гэтых двух элементаў—надзвычайнай займальнасці ў кампазіцыі і фабуле з моцнай асновай на цвёрдым грунце штодзённай рэчаіснасці—знамянуе сабою творчае аблічча Яніны Бранеўскай.

«Гісторыя тачонага дзеда і маляванай бабкі» апісвае саракагадовае жыццё двух лялек. Лялькі нараджаюцца на фабрыцы і выходзяць у «свет». Сорак год яны назіраюць жыццё, бачаць нястачы і эксплаатацыю, дзівяцца з парадоксаў і супярэчнасцей капіталістычнага свету. Дзівяцца яны і з развіцця тэхнікі і цывілізацыі. Не разумеюць, як гэта сталася, што пакінулі яны фабрыку на дыліжансе, а праз 40 год падарожнічаюць на самалёце.

Бранеўская драматызіруе жыццё вакол сваіх герояў, вакол лялек. Самі лялькі адыгрываюць ролю хутчэй пасіўную. Яны толькі наглядаюць, самае большае—дзівяцца. Зло, якое закладзена ў капіталістычным ладзе, не дадзена з сярэдзіны, ад жыцця лялек, а толькі звонку, ад жыцця, якое атачае іх, праходзіць паўз іх. У жыцці самых лялек аўтар не паказвае трагічных момантаў, вынікаючых з капіталістычнага ладу.

Але нават паказу капіталістычнага жыцця звонку хапіла, каб у рэцэнзіі міністэрства асветы для некалькіх бібліятэк было напісана: «Кніжка гэтая абуджае класавую нянавісць». Гэта быў першы дыплом, выдадзены буржуазнай уладай Яніне Бранеўскай.

Першая аповесць Бранеўскай выразна акрэсліла ідэалагічныя пазіцыі аўтара. Бранеўская выявіла сябе як гуманістка. Яна не заклікае да барацьбы з подлым ладам—ні непасрэдна, ні праз сваіх персанажаў, ні ў выніку аб'ектыўнага паказу свету і яго з'яў. Бранеўская спачувае. Яна заўсёды на баку пакрыўджаных. Яе светапогляд гуманістычны, яна ідзе па слядах вялікай польскай гуманісткі Элізы Ажэшка. Гуманізмам прасякнуты таксама аповесці Бранеўскай «Прыгоды трапічнай Бальбісі» (1936 год), «Цяпэк-валацуга» (1939 год).

«Прыгоды трапічнай Бальбісі» былі адказам на ўзмацненне хвалі антысемітызма ў былой Польшчы. Лялька Бальбіся нарадзілася ў сям'і бедных яўрэйскіх краўцоў-заплатнікаў. Зрабіў яе яўрэй-заплатнік не з прыгожага, арыстакратычнага матэрыялу, а з абрэзкаў і шматкоў. І гэтая бедная, «яўрэйская» лялька прыносіць шчасце ўсім, хто з ёю гуляе, хто яе любіць. А любіць яе яўрэйскі бедны кравец, любіць яе бедная старая бабка, над ёю апякуе абшарпаны вандроўны катрыншчык.

Значэнне «Прыгодаў трапічнай Бальбісі» было вельмі вялікае. Чалавечы змест гэтай кніжкі быў супроцьядзем на атрутныя намаганні рэакцыйных, антысеміцкіх пісьменнікаў.

Вядома, што і на гэты раз не абышлося без «дыплома» з боку афіцыйных жрацоў польскай літаратуры. Афіцыйны ўрадавы «Літаратурны летапіс», ацэньваючы другую кніжку Бранеўскай, заявіў, што аўтар знаходзіцца пад уплывам і захоплен прынцыпамі сучаснай рускай літаратуры. Гэта быў яўны намёк для паліцыі: Бранеўская піша пад уплывам совецкай літаратуры.

Аднак, Бранеўская не сышла з абранай ёю дарогі. У наступнай аповесці «Цяпэк-валацуга» аўтар асуджае расавую нянавісць. Гэта асуджэнне не відаць выяўна, яно пададзена іншасказальна: чырвоны злоўвак чорнага цэзара ўсёй пякельным прывідам над поўным тэмпераменту і бунту аўтарам. Пёс Цяпэк хоча гуляць з кошкай, але вочы гэтай кошкі палымнеюць бяздоннай нянавісцю.

«Цяпэк,—піша Бранеўская,—нічога не разумее. Адкуль столькі злосці ў гэтым звярку? Мае чатыры лапкі, як і Цяпэк. Шубка яе не блеклая і не кудлатая, але ўсё-ж звярыная шубка». Гучыць гэта так, нібы аўтар хацеў сказаць: «Мае, праўда, іншы абрыс носа і іншы колер валасоў, але-ж такі самы чалавек, як і кожны. Чаму-ж яго ненавідзяць, чаму яго б'юць?»

Як у папярэдніх творах, так і тут аўтар выяўляе свае сімпатыі да простага працоўнага люду. Хто праследуе, хто б'е без жалю Цяпэка-валацугу? Напышлівы пан выкідвае яго з дому, багатая пані хоча зрабіць яго нявольнікам, фальшывамонетчык здзекуецца над ім. А любіць яго дабрадушная кухарка Агнешка, бароніць яго бяспраўныя, які носіць атопкі. Але не толькі яны: апекуе над ім і... цёмнасіні мундзір, альбо польскі паліцыянт.

Паказваючы паліцыянта, Бранеўская мела добры намер, яна хацела паказаць адну з найбольш агідных, цынічных з'яў капіталістычнага свету: паліцыянт, які збівае беспрацоўнага, зліташаўся над псом. Але каб даць гэты вобраз зусім рэалістычна, пісьменнік павінен быў быць вольным ад прывіду цэнзуры. Таму Бранеўская не магла паказаць, як паліцыянт б'е беспрацоўнага. Застаўся толькі момант міласлівасці паліцыянта да пса, — пса Цяпэка, на баку якога ўсе нашы сімпатыі. Такая прапорцыя дэфарміравала гуманістычную ўстаноўку аўтара. У выніку атрымалася крыху сантыментальная аповесць, у якой яўная дысгармонія як у стылі, так і ў кампазіцыі. У пачатку аповесці стыль дынамічны, вобразы моцныя і імклівыя, пад канец лінія стылю збочвае, персанажы становяцца цьмянымі і, што найважней, не адчуваецца трагізма, які павінен быў праявіцца ў бяздомнага валацугі, нутрана бунтуючага джэклондаўскага пса.

Ва ўсіх гэтых творах Бранеўскай выступае, як мы казалі, больш альбо менш выразна момант соцыяльны. Часамі ён з'яўляецца асновай тэмы, ідэйным касцяком. Часамі ён толькі ілюстрыруе жыццё. Але ва ўсіх гэтых творах Бранеўская яшчэ не ўзнялася да шырокай сінтэтычнай крытыкі капіталістычнага ладу. Значным крокам наперад у гэтым кірунку з'яўляецца кніжка, пачатая яшчэ перад вайной—за кардонам, а закончаная на вызваленай зямлі Заходняй Беларусі. Гэта — аповесць для старэйшых дзяцей «Вандроўкі меднага грошыка».

І калі буржуазны «Літаратурны летапіс» пісаў у свой час, што Бранеўская знаходзіцца пад уплывам сучаснай рускай літаратуры, то цяпер непасрэднае дачыненне да совецкай рэчаіснасці вельмі дадатна ўплыло на росквіт таленту пісьменніцы. Гарызонт вызваліўся ад элементаў своеасаблівага сантыменталізма. Ён пераходзіць на шляхі соцыялістычнага рэалізма.

У «Вандроўках меднага грошыка» нашу ўвагу зноў прыцягвае цікавы замысел аўтара, цікавая фабула. Звычайны грошык вандруе з рук у рукі, — ад сына рабочай сям'і да касцёльнага жабрака, потым, да селяніна, што дае аўтару магчымасць паказаць рэалістычныя малюнкі вясковага жыцця ў панскай Польшчы — хваробы, цемнату, хцівасць ксяндза, гнёт падаткаў, нястачы. Праз вандроўкі грошыка паказваецца фабрычнае прадмесце, забастоўка рабочых, агідныя ўчынкі сышчыкаў і г. д., і да т. п. Часам здаецца, ці не залішне тэм, працэсаў, матываў ахоплівае Бранеўская ў адной кніжцы? Але тлумачэнне мы знаходзім у тым, што Бранеўская, адчуўшы сябе, нарэшце, вольнай у творчасці, прагнула выкрыкнуць, выліць на паперу ўсё, што на працягу год гняло яе сэрца, яе мозг і чаго яна не магла з сябе скінуць.

Другі слабы бок «Вандровак меднага грошыка» — стары кампазіцыйны недахоп, які мы знаходзім у большасці твораў Бранеўскай. Грошык, які павінен быць героем аповесці, якраз ім не з'яўляецца. Ён толькі тэхнічны прыём, а не вока, якім мы павінны назіраць свет.

«Вандроўкі меднага грошыка» — новы этап у развіцці творчасці Яніны Бранеўскай. Гэта ўдалы пачатак новага перыяду яе творчасці. Да гэтага новага, совецкага перыяду належыць і рад навел на новыя тэмы: «Зялёныя розы» (ідэя братэрства народаў), «Сустрэча» (сустрэча Чырвонай Арміі), «Кніжка» (са школьнага жыцця) і інш.

Уступаючы ў новы перыяд свайго жыцця і сваёй творчасці, Бранеўская мае перад сабою дзве галоўныя праблемы: папершае, паставіць і вырашыць у сваіх творах тэму ўзрушаючых, глыбокіх змен у жыцці дзяцей, у школе заходніх абласцей БССР, а затым, па-другое, зжыць два вялікіх недахопы ў сваім стылі — недахоп лірыкі і недахоп элементу фантастыкі. Больш цяпла, больш настрою, больш палёту, больш тых элементаў, якіх дзіця беднаты не мела ва ўмовах былой Польшчы і якія яно цяпер чэрпае поўнай далонню.

НОВЫЯ ТЭАТРЫ СОВЕЦКАИ БЕЛАРУСІ

Л. Кобрынскі

I. Польскі драматычны тэатр БССР

Арганізаваны ў першых чыслах лістапада 1939 года ў Гродні польскі абласны драмтэатр не з'яўляўся яшчэ тады канчаткова сфарміраваным тэатральным арганізмам. Акторы прыходзілі і ўходзілі, рэпертуарны план з дня ў дзень, у сувязі з цякучасцю састава, мяняўся. З вялікімі цяжкасцямі тэатр выпусціў сваю першую пастаноўку «Мараль пані Дульскай» Г. Запольскай.

Са студзеня 1940 года гэты тэатр пачаў жыць поўнацэнным мастацкім жыццём. Кіраўніцтва тэатра ўзначальвае выдатны польскі рэжысёр Аляксандр Венгерка, які з сваімі асістэнтамі, рэжысёрамі А. Венгерка (малодшы) і І. Яблонка, прыступае да падрыхтоўкі двух спектакляў—«Каварства і любоў» Ф. Шылера і «Пажыццёвае» А. Фрэдро. З прыняццем кіравання гэтым вопытным майстрам тэатр адразу мяняе сваё творчае аблічча. Ствараецца добры творчы калектыў.

15 сакавіка тэатр, ужо як Дзяржаўны польскі тэатр БССР, паказвае сваю першую значную пастаноўку —«Каварства і любоў».

У добра задуманым афармленні (мастак Я. Рыбкоўскі), пры суправаджэнні стыльнай музыкі (кампазітар Яблонь) разгортваецца гэты класічны твор ва ўсім яго бляску на падмостках новага рэспубліканскага тэатра БССР. Спектакль гэты, упершыню паказаны ў Гродні, а пасля з вялікім поспехам у буйнейшых гарадах заходніх абласцей Беларусі, вылучаецца вялікай культурай выканання. Калі спрэчнымі здаюцца асобныя вобразы, напрыклад, вобраз Луізы, выкананы вельмі традыцыйна, і Вурма, які трактуецца ледзь не станоўчым персанажам, што парушае драматургічную кампазіцыю, і калі не ўсюды быў знішчан сентыменталізм гэтага юнага твора Шылера, дык спектакль у цэлым глядзіцца з вялікай увагай і слова, сказанае са сцэны, захватвае і хвалюе гледача.

У першых чыслах красавіка тэатр выпусціў сваю другую пастаноўку—«Пажыццёвае» польскага класіка Фрэдро. У гэтым спектаклі незабыўны вобраз старога скнары Латэка стварае лепшы актор тэатра Я. Вашчэровіч, які ў сваёй мастацкай палітры мае шмат розных і арыгінальных фарбаў.

У пачатку мая Польскі дзяржаўны тэатр БССР паказаў трэцюю буйную работу —«Пігмальён» Бернарда Шоу. У гэтай едкай сатыры на англійскую драмацкую вярхушку, дзе для таго, каб заваяваць сабе пачэснае месца, не трэба валодаць нікімі заслугамі ці ведамі, а толькі добрай дыкцыяй і акцэнтам арыстакратычных кварталаў Лондана, паколькі прыгожа сказанае слова замяняе там усе вартасці, Венгерка паказаў сябе не толькі добрым рэжысёрам, але і бліскучым шоуаўскім актарам. Спектакль у цэлым вылучаецца стараннай псіхалагічнай распрацоўкай персанажаў і выдатнымі мізансцэнамі. І калі ўдумлівая работа над псіхалогіяй кожнага тыпа камедыіператварыла гэту дасціпную, але разгаворную п'есу Шоу у п'есу жывых людзей, то мізансцэны дапамагаюць удакладніць спрэчныя ўзаемаадносіны яе ўдзельнікаў і ўскрыць ідэю аўтара.

Пастаноўшчык Венгерка добра ведае стыль Шоу, які праводзіць дзею так, што пад канец п'есы, дакладней—у фінальнай сцэне апошняга акта, калі ўсё разыграна, вядучыя персанажы проста, без якой-бы там ні было рэзанёрскай позы пачынаюць абмеркаванне, ці, дакладней, адкрываюць спрэчкі на тэму таго, што адбылося. І вось, выходзячы з гэтага, прафесар Хігінс і Эліза Дулітл—дзяўчына «нізоў», якая стала ахвярай філалагічных эксперыментаў прафесара (А. Венгерка і І. Бароўская), непрымусова сядаюць на бліжэйшае да гледача месца, у даным выпадку на стаячую амаль на авансцэне канапу, і тут вядуць свой заключны дыялаг.

З выканаўцаў, апрача ўжо згаданага А Венгеркі, трэба адзначыць І. Бароўскую, якая ў ролі Элізы, па віне рэжысёрскага замыслу, мала пераканаўчая ў сцэнах да сваёй «цывілізацыі», але якая знаходзіць сябе ў далейшым.

Пераходзячы да ацэнкі ролі старога Дулітла, выкананай Бутрымам, хачу прыгадаць, што Шоу-драматург дае актору вялікую свабоду. Героям і ўсім персанажам сваіх п'ес Шоу дае пэўную задачу—выкрыць м ы с л ь дадзага твора і тым самым ідэю, якая хвалюе аўтара ў часе яго стварэння. І таму інтэлектуальны рысунак персанажаў зроблен аўтарам заўсёды беззаганна, а іх эмацыянальны воблік— іх пачуцці і хваляванні, адным словам, тое, што з'яўляецца асноўным матэрыялам для стварэння праўдзівага і пераканаўчага сцэнічнага вобраза, — ужо менш ясна і чотка намечаны аўтарам (хоць Шоу не скупы на рэмаркі і іншыя заўвагі падобнага парадку). Таму рэдка якія ролі можна так па-рознаму тлумачыць і выконваць, як ролі п'ес гэтага вялікага сатырыка. Вобраз, створаны Бутрымам, хоць і вырываецца з гэтай «салоннай» камедыі з лёгкім ухілам у гратэск, аднак вылучаецца чыстатой рысунка і вялікім акторскім майстэрствам.

У сучасны момант тэатр працуе над двума пастаноўкамі — «Аптымістычная трагедыя» Вс. Вішнеўскага і «Панна Мальчэўская» Г. Запольскай.

«Аптымістычная трагедыя» будзе першай совецкай п'есай, паказанай з падмосткаў гэтага тэатра. Улічваючы гэту вялікую для тэатра падзею, кіраўніцтва і калектыў яго працуюць над пастаноўкай з выключнай увагай і энергіяй.

Пастаноўшчык «Аптымістычнай трагедыі» А. Венгерка выязджаў для падбораў матэрыялаў к пастаноўцы ў Ленінград і Маскву, устанавіў творчы кантакт з аўтарам, які прымае актыўны ўдзел у падрыхтоўцы спектакля, што павінна дапамагчы пастаноўшчыку стварыць на сцэне эпоху і вобразы герояў вялікіх дзён.

Спектакль будзе паказан у канцы верасня ў Беластоку.

Паралельна к гэтай вялікай пастаноўцы ў тэатры ідзе работа над «малай», камернай п'есай Г. Запольскай «Панна Мальчэўская», бічуючай у гэтай камедыі, як і ў «Маралі пані Дульскай», «мараль» польскага мяшчанства. «Панна Мальчэўская» будзе паказана беластоцкаму гледачу ўжо ў першай палове верасня.

Трэба адзначыць добрую работу тэатра са сваёй моладдзю, для якой пры тэатры створана студыя.

Польскі драматычны тэатр БССР атрымлівае ўсе ўмовы для плённай творчай работы. Бюджэт тэатра дае яму магчымасць працаваць над буйнейшымі творамі совецкіх драматургаў, над творамі рускай і заходне-еўрапейскай класікі. Адпушчаны таксама сродкі на рамонт і пераабсталяванне сцэны тэатральнага памяшкання ў Гродні, якое павінна быць прыстасавана для творчай работы тэатра рэспубліканскага значэння.

Апрача ўсіх гэтых матэрыяльных умоў і вялікай увагі совецкай грамадскасці, калектыў маладога тэатра атрымлівае ў Совецкім Саюзе тое, чаго ён не мог мець у капіталістычнай Польшчы, чаго не можа даць творчаму работніку тэатра ні адна капіталістычная краіна і што з'яўляецца самым каштоўным, дарагім і неабходным для творчага росту тэатра,—гэта культурнага совецкага гледача, які адносіцца к тэатральнаму мастацтву з належнай увагай і любоўю і якога тое, што адбываецца на падмостках сцэны, хвалюе і захапляе.

II. Беластоцкі яўрэйскі драматычны тэатр

У капіталістычнай Польшчы, як і ў іншых капіталістычных краінах, мастацтва не было здабыткам народа. Масы працоўных не маглі па матэрыяльных меркаваннях наведваць тэатры. Але матэрыяльныя меркаванні не былі рашаючымі. Рэпертуар тэатраў, іх стыль і тэматыка не цікавілі працоўных і былі ім чужымі.

Усякія спробы стварэння тэатраў для мас, сапраўдных рэалістычных тэатраў, у якіх працоўныя знайшлі-б сябе і хвалюючыя іх праблемы, былі ўрадам і муніцыпалітэтамі матэрыяльна зруйнаваны, разагнаны і закрыты. На сцэнах дзяржаўных тэатраў панаваў рэпертуар эклектычны, які вонкава нібы кантрастыраваў між сабою па форме і па зместу, але па сутнасці меў адзіны характар і адзіную мэту, —выгнанне жыцця са сцэны.

Нямногія буйныя майстры ставілі вялікія спектаклі з твораў польскіх рамантыкаў Міцкевіча, Славацкага, Красінскага, неарамантыка Выспянскага; з замежных драматургаў шмат месца займалі Метэрлінк, Гофманстааль, Жыраду, Както і іншыя, якія цягнуліся то к сімвалічнаму рамантызму, то «горда» неслі сцяг ваяўнічага імпрэсіянізма. Але гэтымі сур'ёзнымі работамі займалася толькі малая група вядучых рэжысёраў тэатра. Ва ўсіх астатніх тэатрах панавала лёгкая французская, венская і венгерская камедыя і вадэвіль. Флерс і Каяве, Паніоль, Савуар, Ашар, Мальнар, Бус Фекетэ, Фодор і інш., асяляўшыя тэатральныя рынкі капіталістычнай Еўропы, мелі свой вялікі філіял у Польшчы.

Капіталістычная Польшча мела таксама сваіх «майстроў» гэтага жанру, якія з году ў год выпускалі творы, маючыя на мэце забаўляць «імушчых» і туманіць «неімушчых», а аўтарам забяспечваць камфорт і «пашану» у грамадстве.

Але апрача гэтых двух жанраў тэатральнага мастацтва быў і трэці, вельмі распаўсюджаны, які карыстаўся вялікім поспехам на падмостках розных сцэн капіталістычнай Польшчы. Гэта тэатр-рэвю. Польскія тэатры-рэвю—«Квіпрокво», «Марское вока», «Варшаўскі цырульнік» і іншыя са сваімі сантыментальнымі і забаўляльнымі нумарамі, разлічанымі на густ сярэдняга буржуа, з'яўляліся далейшым доказам разлажэння польскай капіталістычнай тэатральнай культуры.

Тэатры-ж другіх народаў, пражываючых у Польшчы,—украінцаў, беларусаў, яўрэяў—былі цынічна і груба праследуемы і знішчаемы.

Антысемітызм, адзін з самых подлых і каварных метадаў панавання буржуазіі ў капіталістычнай Польшчы, у апошнія годы лютаваў у размерах, пакідаючых ззаду царскую Расію. Усё гэта поўлае цкаванне адчуваў на сабе і яўрэйскі актор.

Яўрэйскія акторы, амаль не маючыя стацыянарных тэатраў, вандруючы з аднаго горада ў другі, з аднаго мястэчка ў другое, нібы шолам-алэйхемаўскія «блукаючыя зоркі», збіралі ва ўсіх гэтых месцах усё праклянцце прыніжэння і знеслаўлення.

Няўвага да іх з боку ўлады была ім «лепшай увагай», адсутнасць «клопатаў» —проста шчасцем, бо пан староста ў горадзе і пан паліцыянт у мястэчку вырашалі лёс жыцця і смерці яўрэйскіх тэатральных калектываў.

Толькі вялікі голад тэатра, які жыў у яўрэйскіх працоўных масах, здолеў пераадолець ўсе гэтыя цяжкасці, апрануць і накарміць сваіх артыстаў. Не гледзячы на ўсе забароны, ўдавалася часамі пад іншай назвай, скажаючай змест п'есы, цэнзураваць экземпляр рэвалюцыйнай п'есы, якую з нецярплівасцю чакалі і горача прымалі працоўныя гарадоў і мястэчак. Але гэта былі выключэнні. Пераважная большасць яўрэйскіх тэатраў за апошнія годы расхалтурылася, усё больш і больш трацячы сувязь з сапраўдным тэатральным мастацтвам.

Але ведаў яўрэйскі актор аб краіне, дзе праца работніка мастацтваў цэніцца нароўні з працай шахцёра і інжынера, тэкстыльшчыка і доктара, дзе актораў і рэжысёраў узнагароджваюць і прысвойваюць ім званні, дзе можна тварыць на карысць працоўных. І калі пала панаванне прыгнёту, акторы знайшлі на совецкай зямлі поўную магчымасць ажыццявіць свае мары. Яны прынеслі новаму, совецкаму тэатру сваю любоў да мастацтва і сваю вялікую працавітасць.

Беластоцкі яўрэйскі драматычны тэатр, як і польскі, прайшоў некалькі фаз арганізацыі. Трупа актораў і рэжысёраў, пераехаўшых з Вільні ў Гродню, сумесна з групай актораў, пражываючых у Гродні, стварыла першы спектакль «Жыццё кліча» Біль-Белацэркоўскага і ўпершыню паказала яго ў кастрычніцкія дні працоўным Гродні. К канцу 1939 года Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР вынесла рашэнне аб арганізацыі Яўрэйскага абласнога тэатра ў Беластоку. У сувязі з гэтым група Гродзенскага тэатра была пераведзена ў Беласток. У той-жа час у Беластоку, як у буйнейшым цэнтры заходніх абласцей Беларусі, сабралася вялікая колькасць яўрэйскіх актораў з Варшавы і іншых гарадоў былой Польшчы, лепшыя з іх былі прыняты ў састаў гэтага тэатра. Тэатр папоўніўся і групай творчых работнікаў Бакінскага яўрэйскага тэатра.

У лютым 1940 года тэатр прыступае да падрыхтоўкі спектакля П. Маркіша «Сям'я Авадзіс», якім і пачынае свой першы сезон. Спектакль быў пастаўлен А. Марэўскім, аформлен мастаком Розенцвейгам і кампазітарам Крыштул. Нажаль, гэты спектакль нельга лічыць удалым. П'еса аб совецкіх людзях, аб іх штодзённай працы і гераізме не знайшла ў рэжысёрскім замысле, як і ў акторскім выкананні, адпаведнага раскрыцця.

7 мая Беластоцкі яўрэйскі абласны тэатр выпусціў другую прэм'еру, па сутнасці аднаўлены спектакль, які бакінскія акторы ігралі ў Баку,—«Крывавы жарт» Шолам-Алэйхема ў пастаноўцы І. Міндліна. Гэту пастаноўку можна лічыць адной з лепшых сцэнічных інтэрпрэтацый гэтага глыбока драматычнага шолам-алэйхемаўскага твора. Мэтанакіраванасць у разгортванні дзеі, добры рысунак вобразаў робіць асноўную мысль яснай і лёгкай і ўспрымаемай гледачом.

Трэба адзначыць, як добра справіўшыхся з сваімі ролямі, Крамера ў ролі Іванова, а таксама Эпштэйна і Нісенцвейга ў бліскуча выкананых эпізадычных ролях.

25 мая тэатр выпусціў трэцюю прэм'еру, таксама ўжо іграны раней спектакль, але папоўнены новымі акторамі, — «Гершэле Остраполер» Гершэнзона ў пастаноўцы Бергольскага і Крамера.

17 жніўня, пасля доўгай і ўпартай падрыхтоўчай работы тэатр выпусціў чацвертую прэм'еру — «Буру» Шэкспіра.

«Бура»—апошні манументальны твор найвялікшага майстра сцэнічнага вобраза і слова. Бурныя с т р а с ц і, дзікая, нястрымная р а д а с ц ь ж ы ц ц я, б а р а ц ь б а чалавека за сваё я, барацьба з чалавеканенавісніцтвам застаюцца недзе далёка—ледзь-ледзь прыкметнымі, як згасаючыя вобразы ў вечаровай імгле, а на іх месца выбіваецца магутнай крыніцай м ы с л ь—аб чалавеку, аб яго жыцці і лёсе, аб ч а л а в е ч ы х у з а е м а а д н о с і н а х.

Выказванні Праспера—Шэкспіра ў гэтым апошнім творы вялікага паэта і мысліцеля — не халодныя абстрактныя развагі філосафа, а бурны патох з паранега чалавечага сэрца — чалавека, пазбаўленага людзьмі ўсіх аздоб жыцця, асуджанага на гібель, як дрэва, абадранае бурай. Але гэта Бура не парадзіла зла і злачынства, а раскрыла ва ўсёй велічы чалавечыя дастоінствы апошняй вялікай постаці Шэкспіра. У гэтым творы Шэкспір уздымаецца да вяршынь гуманізма.

Да ацэнкі гэтага спектакля, які з пункту гледжання пастаноўкі ўяўляе сабою вялікую цікавасць, мы яшчэ вернемся. Трэба толькі адзначыць, што спектакль гэты мог быць ажыццёўлен пры наяўнасці такіх буйных актораў, як А. Марэўскі, Л. Ландаў, М. Ліпман і інш., а таксама пры вялікай і ўпартай рабоце маладога рэжысёра М. Віскінда.

У сучасны момант тэатр працуе над двума спектаклямі — «Юліс» Данііела ў пастаноўцы М. Віскінда і «Стэмпеню» Шолам-Алэйхема ў пастаноўцы Цэйтліна.

Свае спектаклі тэатр паказаў, апрача Беластока, у Пінску, Баранавічах і Гродні.

Беластоцкі яўрэйскі драматычны тэатр знаходзіцца яшчэ ў стане фарміравання. Кіраўніцтва гэтага тэатра не выкарыстала ў дастатковай ступені свае кадры і не здолела заваяваць сабе той увагі і поспехаў у гледача, якой дасягнуў польскі драматычны тэатр, хоць апошні і не мае такой колькасці добрых актораў, якую мае яўрэйскі тэатр.

Чым хутчэй гэты тэатр пераможа свае цяжкасці, тым лепш будзе для яго і тым хутчэй атрымаюць беластоцкія працоўныя добры яўрэйскі драматычны тэатр, які мае ўсе даныя для таго, каб стаяць поруч з лепшымі тэатрамі БССР.

ТВОРЧЫЯ КАЛЕКТЫВЫ БЕЛАСТОКА

Да прыходу вызваліцельніцы — Чырвонай Арміі—у Беластоку і вобласці не было ні пастаяннага тэатра, ні, тым больш, такіх мастацкіх калектываў, як сімфанічны аркестр ці ансамбль песні і пляскі.

Совецкая ўлада абудзіла да жыцця народныя таленты, адкрыла дарогу да культуры для ўсіх працоўных заходніх абласцей, забяспечыўшы рост і росквіт культуры і мастацтва, нацыянальнага па форме, соцыялістычнага па зместу.

У шматлікіх дзяржаўных мастацкіх установах Беластоцкай вобласці паспяхова працуюць сотні актораў, музыкантаў і майстраў народнай творчасці, дзесяткі мастакоў, кампазітараў і архітэктараў, якія ўважліва вывучаюць і асвойваюць совецкую культуру.

Пяць тэатраў, абласная філармонія ў саставе сімфанічнага аркестра, беларускага ансамбля песні і пляскі і дзяржаўнага джаза пад кіраўніцтвам Э. Рознера, Яўрэйскі тэатр мініятур, абласны Дом народнай творчасці, які яднае велізарныя масы ўдзельнікаў самадзейнай творчасці, музычнае і мастацкае вучылішчы, ізостудыя, тры музычныя школы, аддзяленне Белдзяржэстрады, музей выяўленчых мастацтваў, ізокамбінат, — гэта толькі сухі пералік народжаных совецкай уладай ачагоў культуры, бурна растучых і мацнеючых у здаровай атмасферы соцыялістычнай рэчаіснасці.

Дзяржаўны польскі драмтэатр БССР, створаны з актораў розных тэатраў і напрамкаў, здолеў шпарка ператварыцца ў зладжаны ансамбль вялікага мастацкага значэння, які за сем месяцаў сваёй работы ажыццявіў пяць пастановак: «Каварства і любоў» Ф. Шылера, «Пігмальён» Б. Шоу, «Пажыццёвае» А. Фрэдро, «Мараль пані Дульскай» і «Панна Мальчэўская» Г. Запольскай. Маладыя рэжысёры заканчваюць работу над кампазіцыяй канцэрта, пабудаванага на польскім фальклоры.

Работа Яўрэйскага драматычнага тэатра над п'есамі «Сям'я Авадзіс» П. Маркіша, «Крывавы жарт» Шолам-Алэйхема, «Гершэле Остраполер» Гершэнзона, «Бура» Шэкспіра выявіла акторскія магчымасці тэатра, падводзіць яго шчыльна да стварэння п'ес вялікай мастацкай сілы. Цяпер рыхтуюцца да пастаноўкі «Стэмпеню» Шолам-Алэйхема і «Юліс»—п'еса совецкага драматурга Данііела аб годах грамадзянскай вайны. У плане тэатра таксама пастаноўка «Разлома» Лаўрэнёва.

Арганізаваны ў канцы 1939 года Дзяржаўны яўрэйскі тэатр мініятур, які знаходзіцца ў сістэме абласной філармоніі, прайшоў вялікі і складаны творчы шлях ад стварэння малазначных праграм да пастаноўкі цікавага па форме, актуальнага па зместу спектакля, пабудаванага цалкам у плане тэатра мініятур. Паездка гэтага тэатра па гарадах Совецкага Саюза, паспяховыя выступленні яго ў Маскве даюць падставу меркаваць, што трэцяя праграма тэатра, якая рыхтуецца цяпер, яшчэ вышэй узніме яго мастацкі ўзровень і прынясе яму новы заслужаны поспех.

Другім тэатрам такога тыпу з'яўляўся польскі тэатр мініятур, асноўны творчы састаў якога ўліт цяпер у Дзяржаўны польскі драмтэатр для арганізацыі пры ім канцэртнай групы малых форм.

Па абслугоўванню глыбінных пунктаў у вобласці працуе Яўрэйскі перасоўны тэатр, у рэпертуары якога «Тэв'е-малочнік» і «200.000» Шолам-Алэйхема.

Арганізаваны ў Гродні Польскі лялькавы тэатр паказаў сваю першую пастаноўку «Наш цырк» у гарадах Беластоцкай вобласці. Цяпер тэатр перададзен Баранавіцкай вобласці і працуе ў Стаўбцах.

Дзяржаўная абласная філармонія аб'ядноўвае чатыры калектывы з агульнай колькасцю 200 чалавек і разгарнула вялікую канцэртную дзейнасць.

Паспяхова працуе дзяржаўны джаз пад мастацкім кіраўніцтвам Э. Рознера. Яго выступленні на лепшых канцэртных пляцоўках Совецкага Саюза паказалі высокія мастацкія якасці джаза. Да 23-й гадавіны Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі калектыў рыхтуе новую праграму на матэрыялах совецкіх, у тым ліку беларускіх кампазітараў.

За апошні час мастацка акрэп і вырас сімфанічны аркестр (дырыжор тав. Шаевіч), які абслугоўвае цяпер курорт Друскенікі. За час свайго існавання ён падрыхтаваў звыш 20 праграм. Месяц работы аркестра пад кіраўніцтвам запрошанага з Ленінграда засл. дзеяча мастацтваў прафесара-ордэнаносца В. Э. Хайкіна прыкметна ўзняў яго ўзровень. Цяпер рыхтуецца праграма, складзеная выключна з твораў беларускіх кампазітараў, у тым ліку і мясцовых.

Беларускі ансамбль песні і пляскі пад кіраўніцтвам Р. Р. Шырмы складаецца з 60 чалавек, безупынна папаўняецца лепшымі прадстаўнікамі самадзейнага мастацтва і мае ў сваім рэпертуары шмат сапраўды народных песень і плясак, своеасаблівых па каларыту і апрацоўцы.

Ансамбль абслугоўвае глыбінныя пункты заходніх абласцей БССР і карыстаецца нязменным поспехам.

Бліскучай ілюстрацыяй таго, якія невычарпальныя творчыя магчымасці тояцца ў народзе і як буйна расцвітаюць на вызваленай зямлі народныя таленты, могуць служыць паказальнікамі работы, праводзімай абласным Домам народнай творчасці. Пачаўшы сваю работу ў лістападзе 1939 года, абласны Дом народнай творчасці арганізаваў у гарадах і сёлах вобласці 141 гурток мастацкай самадзейнасці, ахапіўшы імі каля 4 тысяч чалавек.

Пры самым Доме народнай творчасці пастаянна працуюць самадзейныя калектывы: хор, сімфанічны аркестр, аркестр народных інструментаў. Арганізаваны ізостудыя, школа танцаў.

Велізарная работа праведзена мастацкай самадзейнасцю ў дні выбарчай кампаніі, калі па вобласці было дадзена звыш 300 канцэртаў.

Дзевятнаццаць раённых аглядаў, гарадская і абласная алімпіяды і выстаўкі народнай творчасці паказалі вялікі размах самадзейнага мастацтва і выявілі шмат таленавітых калектываў і асобных выканаўцаў. 12 мастакоў-самавучак, 8 вышывальшчыц, 2 гурткі ткачых рыхтуюцца да выстаўкі «Ленін і Сталін—арганізатары беларускай дзяржаўнасці».

Цяпер праводзіцца радыёфестываль мастацкай самадзейнасці, рыхтуюцца праграмы выступленняў у дні свята гадавіны вызвалення, вядзецца падрыхтоўка да Усесаюзнага агляду тэатральнай самадзейнасці.

У Беластоку працуе каля 50 мастакоў жывапісцаў, графікаў, афортыстаў, скульптараў, дэкаратараў. Работы некалькіх мастакоў былі прадстаўлены на дэкаднай выстаўцы ў Маскве, а цяпер 20 лепшых жывапісцаў, графікаў і скульптараў, атрымаўшых урадавыя заказы да выстаўкі «Ленін і Сталін—арганізатары беларускай дзяржаўнасці», асвойваючы прынцыпы соцыялістычнага рэалізма, з вялікім натхненнем і творчым уздымам працуюць над завяршэннем твораў.

Работы мастакоў Кшчаноўскага, Ландау, Малярэвіч, братоў Зайдэнбойтэль, А. Бермана, Гельмана, Цэнтнершвер, Ральпіцкага, Цібера, скульптара Мессера і іншых сведчаць аб вялікіх здольнасцях аўтараў і, трэба меркаваць, зоймуць не апошняе месца на надыходзячай выстаўцы.

Дом мастака і ізостудыі сур'ёзна дапамагаюць палітычнаму і прафесіянальнаму росту мастакоў, праводзячы сярод іх вялікую палітыка-выхаваўчую, грамадскую і творчую работу. Вялікую вытворчую работу вядзе беластоцкі ізокамбінат.

Створаныя і працуючыя ў трох гарадах вобласці музычныя школы паказваюць, наколькі вяліка цяга дзяцей да музычнай культуры і як многа сярод іх сапраўдных талентаў, якія ў мінулым не маглі нават марыць аб тым, каб атрымаць спецыяльную асвету.

Створанае ў Беластоку аддзяленне Беларускай дзяржэстрады правяло значную работу па абслугоўванню раёнаў вобласці канцэртнымі брыгадамі. Такія артысты беластоцкай эстрады, як тт. Камен, Кусевіцкі і інш., карыстаюцца заслужаным поспехам у гледача.

З пачатку бягучага навучальнага года ў Беластоку прыступіла да работы абласное музычнае вучылішча.


У дні гадавіны адкрываецца мастацкае вучылішча, а ў бліжэйшы час адчыніць свае дзверы музей выяўленчага мастацтва, для якога ў былых маёнтках і палацах вобласці сабрана вялікая колькасць цікавейшых экспанатаў.

Абласной камісіяй па ахове помнікаў рэвалюцыі, мастацтва і старажытнасці даследуюцца і бяруцца на ўлік у межах вобласці шматлікія помнікі, якія захаваліся з XI—XII стагоддзяў і якія прадстаўляюць сабою велізарную гістарычную і мастацкую каштоўнасць.


Гэткія творчыя вынікі першага года шчаслівага жыцця працоўных Беластоцкай вобласці пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі.

В. СОКАЛАЎ.

Нам. начальніка Беластоцкага абласнога аддзела мастацтваў.



На заходніх абласцях БССР. На здымку: Палац-музей у Белавежы. Фота В. Лупейкі. (БЕЛТА).



Палацы—працоўным! На здымку: Клуб рабочых Беластоцкага фанернага завода № 7, адкрыты ў палацы былога ўласніка завода.

Фота Е. Халдзея (БЕЛТА).

МАСТАЦКІ РЭПЕРТУАР ВАЕННЫХ АРКЕСТРАЎ

Праведзеная гэтымі днямі ў Мінску акруговае спаборніцтва духавых аркестраў раскрыла і паказала шмат цікавых бакоў музычнай культуры гэтага жанру, нажаль, забытага ў мастацкім жыцці совецкіх і грамадскіх арганізацый і нават арганізацый, якія спецыяльна займаюцца пытаннямі музычнай асветы і распаўсюджвання музычнай культуры.

Ва ўмовах Чырвонай Арміі справе развіцця мастацтва, музыкі надаецца велізарнае значэнне. Штатныя духавыя аркестры —музычныя падраздзяленні — з'яўляюцца не толькі сродкам умацавання і ўзмацнення дысцыпліны паходнага марша, але і велізарным сродкам палітычнага і культурнага выхавання асабістага саставу часцей.

Канцэрт—мастацкая праграма, побач са службова-страявым рэпертуарам, займае ў сістэме спецыяльнай падрыхтоўкі ваеннага аркестра вялікае месца.

На спаборніцтвах прымалі ўдзел лепшыя аркестры часцей Заходняй асобай ваеннай акругі. Маладыя капельмейстры сустрэліся з капельмейстрамі-ветэранамі. Паводле выкананых на спаборніцтвах праграм можна меркаваць аб найбагацейшых магчымасцях ваенных музыкантаў у справе развіцця ў часцях музычна-выхаваўчай работы.

Капельмейстар ст. лейтэнант Салтыкоў даволі смела падышоў да выбару рэпертуару: «Песня аб Сталіне» з сімфанічнай паэмы аб Сталіне кампазітара Хачатурана—твор складаны, патрабуючы ўдумлівага выканання і майстэрскай перадачы музыкальнай фразы, своеасаблівы і выпуклы, глыбокі па аўтарскаму замыслу. Параўнальна малады аркестр тав. Салтыкова выканаў гэту рэч зусім здавальняюча і граматна. Гэты-ж капельмейстар прадырыжыраваў твор Бетховена «Эгмонт». Там, дзе нехапала для аддзелкі майстэрства, падкупалі шчырасць і тэмперамент дырыжора і аркестрантаў. Але гэта не знізіла вартасць калектыва музыкантаў, — у асноўным трактоўка музычных вобразаў была правільнай і ігра ў цэлым гучала добра і рабіла прыемнае ўражанне.

Малады капельмейстар тэхнік-інтэндант 2 ранга Барысаў сіламі свайго добра падабранага і сыгранага аркестра выканаў першую частку V сімфоніі Бетховена. Малады дырыжор некалькі рамантызіраваў рэалістычны твор вялікага музыканта, але рамантычная трактоўка была стрыманай, блізкай да рэалістычнага зместу. Першыя-ж узмахі рукі капельмейстра паказалі ў ім вельмі і вельмі здольнага дырыжора, у перспектыве далейшай работы якога ясны план вялікага росту. Гэта меркаванне слухачоў ён падтрымаў майстэрскім выкананнем балады «Чапаеў» совецкага кампазітара Дзегелёнак.

Інтэндант 2 ранга капельмейстар Рыўкін — старэйшы ў акрузе капельмейстар, які выхаваў дзесяткі чалавек капельмейстраўскай моладзі. Ён любіць музыку і жыве ёю. Ён любіць свой аркестр. Ён ведае напамяць партытуры, яму не патрэбны ні пульт, ні ліст. Рэпертуар яго разнастайны, аркестр сыграны і граматны. У дасканалай школе духавога ансамбля-калектыва ён паказвае фантазію з «Лебядзінага возера» Чайкоўскага, штраусаўскія вальсы. У яго рэпертуары дзесяткі твораў: фантазія з «Рыгалета», творы Бізэ, Сен-Санса, Мусаргскага, Рымскага-Корсакава і г.д.

Аркестры Рыўкіна, Барысава і Салтыкова па сваёй культуры і сыгранасці вылучыліся на вядучыя месцы і прэміраваны. Яны, несумненна, будуць мастацка развівацца і паслужаць прыкладам для іншых аркестраў у сэнсе барацьбы за музычна-выканаўчую культуру высокай якасці.

Музыканцкі ўзвод воінскай часці—вялікая сіла, якая дапамагае камандаванню арганізаваць дасканалую дысцыпліну марша баявых калон на паходзе, і разам з тым—вялікая культурная адзінка, якая садзейнічае органам палітпрапаганды ў палітычным выхаванні чырвонаармейскага і начальніцкага саставу. Канцэрты духавых аркестраў у часцях—звычайная з'ява, камандзір-жа музыканцкага падраздзялення — капельмейстар — арганізатар масавай музычна-мастацкай самадзейнасці.

У клубах профсаюзаў і раённых дамах соцкультуры налічваецца вялікая колькасць духавых аркестраў, але рэпертуар іх часам абмяжоўваецца заіграўшымі мелодыямі «дзяжурных» песень і танцаў. У сэнсе падрыхтоўкі канцэртнай праграмы, каб быць дзейсна-карыснымі і несці сапраўдную музычную культуру калектывам, ім трэба браць прыклад з ваенных духавых аркестраў.

В. МУРАТ.

У барацьбе за выпаўненне Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР

Пачатак перабудовы

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета Саюза ССР ад 26 чэрвеня 1940 года быў сустрэчан работнікамі тэатраў Савецкай Беларусі з вялікім здавальненнем. Усе сумленныя работнікі тэатра зразумелі і ацанілі велізарнае значэнне Указа, які адкрывае «новыя магчымасці павышэння прадукцыйнасці працы, пашырэння культурнага абслугоўвання працоўных і далейшага ўзняцця мастацкага ўзроўню работы тэатраў пры скарачэнні расходнага бюджэта тэатраў» **(з загада Усесаюзнага Камітэта па справах мастацтваў).**

Два месяцы работы па-новаму ў тэатрах БССР далі ўжо станоўчыя вынікі.

З пераходам на 8-гадзінны рабочы дзень і 7-дзённы рабочы тыдзень прадоўжыўся тэрмін рэпетыцый, павялічылася колькасць спектакляў, пачалася работа над новымі п'есамі за кошт дадатковага часу.

Як-жа ажыццяўляецца Указ урада па асобных тэатрах рэспублікі?

Тэатр оперы і балета БССР у мінулым сезоне зрабіў шэсць пастановак. У сучасным сезоне новыя ўмовы дазваляюць тэатру ажыццявіць восем пастановак. Хор і аркестр тэатра загружаны работай поўнасцю.

Тэатр дабіваецца зніжэння кошту пастановак. Перагледжаны штаты. Так, вызвалены ад працы два дырыжоры і пакінуты тры з поўнай нагрузкай і г. д. Работа пастановачнай часткі пераводзіцца на гаспадарчы разлік. Гэтым будзе значна зніжан кошт прадукцыі.

Але ў Тэатры оперы і балета зроблена яшчэ далёка не ўсё. Не гледзячы на павелічэнне колькасці пастановак, частка салістаў тэатра яшчэ застаецца незагружанай. Некаторыя працуюць па 3—4 гадзіны ў дзень. І тлумачыцца гэта, галоўным чынам, тым, што суадносіны вакальных партый салістаў непрапарцыянальны і што колькасць работы некаторых салістаў не зусім адпавядае прад'яўляемым патрабаванням.

Асноўная маса артыстаў балета працуе 8 гадзін у дзень. Але салісты таксама не заўсёды выконваюць сваю норму. Напрыклад, у верасні тры прымабалерыны заняты толькі ў балеце «Салавей», а балет гэты ставіцца ўсяго 5 разоў. Паводле намечанага на 1940—41 год рэпертуару, салісты балета будуць больш загружаны, але ўсё адно не ўсе 8 гадзін.

У тэатры оперы і балета меў месца рад выпадкаў парушэння Указа: непрыход з адпачынку, прагулы, уход з работы і г. д.

З дня выдання Указа і па 20 жніўня было шаснаццаць выпадкаў парушэння працоўнай дысцыпліны, якія былі прадметам разгляду суда і пракуратуры. Найбольш злосныя парушальнікі працоўнай дысцыпліны — саліст балета Курылаў, які не вярнуўся пасля адпачынка ў тэатр, і саліст балета Хандамаў. Гэта — тыповы лятун па дэкадах: беларуская дэкада — чацвертая па ліку, у якой ён прымаў удзел.

Да апошняга часу ў тэатры не было дакладнага ўліку прыходу на работу і ўходу з работы. Толькі зараз дэтальна распрацавана і ўведзена новая сістэма ўліку, якая выключае магчымасць пропуску фактаў парушэння працоўнай дысцыпліны.

У Рускім драматычным тэатры БССР, у адпаведнасці з загадам Усесаюзнага Камітэта па справах мастацтваў, зменены нормы выступлення работнікаў тэатра. Ушчыльненне рабочага дня дазволіла павялічыць колькасць дзённых і вячэрніх, а таксама паралельных (выязных) спектакляў. З пачатку канцэртнай работы, г. зн. з 10 па 25 жніўня, дадзена шэсць выязных спектакляў пры выкананні нормы на асноўнай базе. Рэпетыруюцца новыя п'есы — «Крэмлёўскія куранты» і «Амазонкі», а таксама паўтараецца бягучы рэпертуар. Ушчыльненне рабочага часу дазволіла тэатру павялічыць рэпертуар у гэтым годзе на адну п'есу.

Цэхі тэатра таксама перайшлі на работу па-новаму. У мантыровачным цэху раней выконвалася толькі непасрэдна мантыровачная работа. За рамонт, пагрузку, выгрузку і іншыя работы была асобная аплата. Цяпер рабочы дзень мантыровачнага цэха поўнасцю ўшчыльнен за кошт выканання дадатковых работ. Электрамантажны цэх раней працаваў толькі ўвечары. Цяпер працуе і ўдзень. Электраманцёры на макетах асвойваюць светлавую апаратуру, праводзяць эксперыменты, што значна павышае якасць светлавога афармлення спектакляў.

Але не ўсе яшчэ ў тэатры выконваюць свае нормы. Некаторыя акторы, не гледзячы на максімальнае выкарыстанне кіраўніцтвам тэатра ўсіх іх магчымасцей і даных, часта маюць усяго тры-чатыры гадзіны загрузкі ў дзень.

У Тэатры музычнай камедыі БССР уся работа перабудоўваецца ў адпаведнасці з новымі ўмовамі. Нормы выступленняў артыстаў выконваюцца толькі з невялікімі адхіленнямі ў той ці другі бок. Напрыклад, у ліпені актрыса Грасава выступіла ў 17 спектаклях замест 15 па норме, актор Астахаў—у 16 замест 17.

Пакартальны ўлік выступленняў дае магчымасць кожнаму актору ўкласціся ў наступным месяцы ў сваю норму.

Тэатр павялічвае ў гэтым годзе свой рэпертуар на адну пастаноўку.

Праводзіцца работа па скарачэнню выдаткаў і павелічэнню прыбыткаў тэатра. У 1940 годзе тэатр перайшоў на непарыўную гадовую работу, што значна павялічвае яго прыбыткі. Скарачаюцца тэрміны выпуску спектакляў. Напрыклад, усе работы (апрача мастацкай) па аднаўленню пастаноўкі «Цыганскі барон» выкананы ў пяць дзён, прычым затраты на афармленне спектакля не перавышаюць трох тысяч рублёў. Былі выкарыстаны наяўныя касцюмы і афармленне.

У справе барацьбы за якасць спектакляў Тэатру музычнай камедыі, бадай, як ніякаму другому, трэба зрабіць вельмі і вельмі шмат. Першачарговая задача, патрабуючая безадкладнага вырашэння, гэта — запрашэнне ў тэатр высокакваліфікаванага мастацкага кіраўніка і папаўненне групы акторамі. Вырашэнне гэтай задачы ў спалучэнні з выкананнем Указа дасць выдатныя вынікі ў сэнсе творчага росту тэатра.

У Тэатры юнага гледача БССР праведзена рад мерапрыемстваў па скарачэнню выдаткаў. Найбольш паказальным прыкладам можа служыць пастаноўка «Казкі» М. Святлова. На гэтай пастаноўцы за кошт выкарыстання наяўных касцюмаў, дэкарацый і т. д. тэатр з'эканоміў 18 тысяч рублёў.

У Тэатры юнага гледача неабходна ўпарадкаваць мужчынскі і жаночы акторскі састаў, які цяпер вельмі непрапарцыянальны. Гэта ўскладняе рацыянальнае выкарыстанне ўсяго састава.

У Гомельскім, Палескім, Бабруйскім і іншых тэатрах рэспублікі, а таксама ў тэатрах заходніх абласцей — беларускіх, польскіх, яўрэйскіх і іншых—творчыя работнікі актыўна змагаюцца за выкананне Указа ўрада.

Пакуль зроблены толькі першыя крокі, праведзена падрыхтоўка к таму пералому, які павінен наступіць у тэатрах у выніку правядзення ў жыццё новых мерапрыемстваў.

Скасаванне пастаянных месц у тэатрах аказалася для многіх кіраўнікоў нечаканым. Да правядзення гэтага мерапрыемства кіраўнікі тэатраў не клапаціліся аб гледачу. Яны ведалі, што білеты ўсе прададзены, і на тым супакойваліся. Адсюль—недастатковая ўвага да якасці спектакляў. У выніку мелі і маюць выпадкі нядобраякаснай падрыхтоўкі спектакляў пры вялікай затраце сродкаў. Так было ў Рускім драматычным тэатры БССР з «Казкай», так было ў Слуцкім калгасным тэатры з «Овадам». Такіх прыкладаў можна-б было прывесці нямала.

Некаторыя кіраўнікі тэатраў пачалі шукаць так званыя «касавыя» п'есы, забываючы, што сапраўды касавая п'еса тая, якая стаіць на высокім якасным узроўні, на якой зроблен добры спектакль.

Паралельна з барацьбой за якасць спектакляў устае пытанне аб неабходнасці правядзення сур'ёзнай работы з гледачом. Рэпертуар тэатраў—гэта рашаючае звяно ў вызначэнні аблічча тэатра, росту тэатра, — часта складаўся непрадумана. Няма яшчэ сур'ёзнай, сістэматычнай работы з драматургамі.

Важнейшая задача, якая стаіць перад кіраўнікамі тэатраў,—гэта правільная арганізацыя працы ўсіх творчых і тэхнічных работнікаў тэатра.

Работа павінна быць пабудавана з такім разлікам, каб цэхі і асобныя творчыя работнікі не толькі не затрымлівалі агульнай работы, а паскаралі выкананне яе.

Восем рабочых гадзін павінны быць поўнасцю аддаены мастацтву, творчасці.

Рэжысёр павінен прыходзіць на рэпетыцыю падрыхтаваным, з загадзя прадуманым рэжысёрскім планам, распрацаванымі мізансцэнамі і г. д. Актор, ідучы на рэпетыцыю, абавязан ведаць і ўмець больш, чым ён ведаў і ўмеў, калі ўходзіў з яе, а пакідаць рэпетыцыю павінен з усведамленнем таго, што ён набыў нешта новае. Трэба безупынна тварыць. І актор гэта павінен рабіць сам, не чакаючы, што гэта зробіць за яго рэжысёр. Толькі такую працу можна назваць творчай.

Вл. НЕФЕД.



Шырока адчыніліся дзверы вышэйшых навучальных устаноў для моладзі заходніх абласцей БССР. На здымку: Педагагічны інстытут у Беластоку.

Фота А. Сапіра. (БЕЛТА).

Перабудаваць творчую работу ў адпаведнасці з Указам

На апошнім сходзе мастакоў ажыўлена абмяркоўваўся даклад аб ходзе рэалізацыі Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня. Выступленні паказалі, што Саюз мастакоў БССР і Белізокамбінат прадпрынялі толькі першыя крокі ў ажыццяўленне Указа. Скарочан апарат саюза, па ізокамбінату людзі расстаўлены па найбольш рашаючых участках вытворчасці. Заведзен улік праваздзімай работы. Але ўсё гэта далёка не вычэрпвае асноўнай задачы, дыктуемай Указам. Пытанне ідзе аб правільнай арганізацыі працы мастакоў, аб ліквідацыі расхлябанасці і недысцыпліныраванасці сярод раду творчых работнікаў, аб сістэматычным невыкананні асобнымі мастакамі сваіх дагавораў з дзяржаўнымі органамі.

У гэтым пытанні і саюз мастакоў і асабліва ізокамбінат фактычна нічога не зрабілі. Работа гэтых арганізацый яшчэ не перабудавана. Бытуюць у творчым асяроддзі няправільныя, часамі шкодныя настроі, што, маўляў, Указ цяжка прыстасаваць да ўмоў спецыфічнай працы мастака. Ён, маўляў, чалавек вольнай прафесіі, ніяк не з'арганізуеш працэс яго работы. Характэрна, што выступіўшы на гэтым-жа сходзе старшыня мясцкома саюза тав. Эйдэльман бездапаможна развёў рукамі і заявіў літаральна наступнае: «Мы не ведаем, што павінна рабіць прафарганізацыя».

Дырэктар ізокамбіната тав. Каплан, мастакі Бембель, Зайцаў, Керзін і інш. ускрылі рад агідных фактаў, якія сведчаць аб тым, што і мясцком і партарганізацыя маюць непачаты край работы ў барацьбе за сапраўднае ажыццяўленне Указа, але работу гэту не праводзяць. Сярод невыконваючых дагаворы з Упраўленнем па справах мастацтваў БССР ёсць комсамолец А. Кроль, мастакі Тарас, Сонкін і... Эйдэльман (старшыня мясцкома). Асобныя работнікі, як Разанецкі, Сталярчык, несур'ёзна аднесліся к дзяржаўным заказам, дагаворы з імі скасаваны. Мастакі Гусеў і Мірынгоф прапусцілі ўсе тэрміны здачы работ Музею рэвалюцыі, а ізокамбінат не знаходзіць метадаў уздзеяння на такіх яўных парушальнікаў дзяржаўнай дысцыпліны. Нядобрасумленна аднесліся да выканання заказаў і мастакі Сямёнаў, Чарняўскі, Ушакоў і іншыя.

Элементы халтуршчыны яшчэ далёка не выкарчаваны сярод некаторых выканаўцаў работ. Так, мастакі Забораў і Кастаусава настолькі нядобраякасна выканалі атрыманы імі важны заказ, што ўся іх работа была забракавана. Пасля ўсіх гэтых фактаў больш чым дзіўнай здаецца нам «бездапаможнасць» старшыні мясцкома Эйдэльмана, які не ведае, як ажыццяўляць Указ.

Правільную прапанову ўнёс на сходзе скульптар тав. Бембель. Па яго думцы, неабходна таварыская дапамога з боку кваліфіцыраваных майстроў асобным мастакам, трэба зазірнуць да іх дамоў, у майстэрню, парадай і ўказаннямі дабіцца своечасовага выканання заказа і высокаякаснай прадукцыі. Ізокамбінат павінен сабраць мастакоў і разам з імі распрацаваць мерапрыемствы па сапраўднай арганізацыі працы мастакоў, па дакладнаму выкананню абавязацельстваў як заказчыкам, так і выканаўцам, па забеспячэнню мастакоў сістэматычнай работай. Сход заклікаў мастакоў да большэвіцкай арганізацыі свайго часу, да рашучага выкарчавання элементаў расхлябанасці і безадказнасці ў рабоце.

І. РУБІНШТЭЙН.

„ЧЫО-ЧЫО-САН“

Прэм'ера Дзяржаўнага ордэна Леніна тэатра оперы і балета БССР

Опера Пуччыні «Мадам Бэттэрфлей» («Мадам матыль») ці «Чыо-Чыо-Сан», як яе іншы раз называюць па імю галоўнай герані оперы, — драма маленькай японкі, пакінутай «цывілізаваным» амерыканскім марскім афіцэрам.

Вобраз пакінутых, няшчасных у жыцці дзяўчат і раней глыбока хвалявалі і кранаў кампазітара і прадаўжаў хваляваць да апошніх дзён яго жыцця. У сваёй опернай творчасці ён стварыў цэлую галерэю такіх вобразаў: Манон (опера «Манон Леско»), Мімі (опера «Багема»), Тоска (опера «Флорыя Тоска»), Ліу (опера «Прынцэса Турандот»).

Сюжэт опернай канвы не складаны, дзея адбываецца ў Японіі. Маленькая цудоўная гейша Чыо-Чыо-Сан, празваная за сваю грацыю і зграбнасць Бэттэрфлей (матыль), выходзіць замуж за афіцэра амерыканскага флота. Яна кахае жаніха і верыць у сваё шчасце з ім. Але для жаніха, афіцэра Пінкертона, жаніцьба — толькі камедыя, часовы капрыз, які ні да чаго не абавязвае яго. Хутка Пінкертон пакідае сваю жонку, зусім адзінокай, без сваякоў, якія праклялі яе за парушэнне старадаўніх сямейных традыцый, без сродкаў.

Адзіная апора няшчаснай жанчыны — верная служанка Сузукі. Сузукі дапамагае Чыо-Чыо-Сан выхоўваць сына, бацька якога нават не ведае аб яго існаванні. Тры годы чакае Чыо-Чыо-Сан звароту мужа, выслухоўваючы знявагі, адхіляючы прапановы аб замужжы. Нарэшце, прыязджае Пінкертон з другой жонкай — амерыканкай Кет. Ён хоча забраць сына ў Амерыку. Чыо-Чыо-Сан, для якой воля мужа свяшчэнна, аддае яму сына і, знясіленая пасцігшым яе горам, у роспачы закалвае сябе кінжалам.

У аснову оперы пакладзена навела амерыканскага пісьменніка Джона Л. Лонга. Навела, перапробленая ў драму Давідам Беласко, вельмі спадабалася Пуччыні, які ўбачыў яе на лонданскай сцэне, і па яго заказу была перароблена лібрэтыстамі Іліка і Джакозе ў лібрэта для оперы, якая і была пастаўлена на міланскай опернай сцэне ў 1900 годзе.

На першай пастаноўцы опера праваліласся. У другі раз яна была пастаўлена з каласальным поспехам 17 лютага 1904 года ў Міланскім оперным тэатры Ля-Скала ў 2-й рэдакцыі. Першапачатковае лібрэта з трох частак было скарочана да двух (быў аб'яднан другі і трэці акты), што надало оперы максімальную лаканічнасць і выразнасць (у апошняй рэдакцыі Пуччыні зноў адмовіўся ад двух актаў і падзяліў апошні акт на дзве часткі).

Лаканічнасць і выразнасць, надзвычайная сцэнічнасць опернай дзеі, драматычная насычанасць з'яўляюцца выдатнымі рысамі ўсіх опер Пуччыні — аднаго з лепшых італьянскіх выразіцеляў новай опернай плыні канца XIX стагоддзя — верызма. Пуччыні заўсёды праследваў тую-ж мэту, што і верысты, — мэту паказу ў операх жыццёвай праўды (веро—праўда) сучасных яму людзей. Адсюль і адмаўленне ад старых оперных форм — знішчэнне «нумернасці» (дзея і музыка непарыўна развіваюцца), адсюль і праўдзівая музычная ілюстрацыя тэксту.

Вакальная партыя Чыо-Чыо-Сан, галоўнага персанажа оперы, вельмі шырокая па дыяпазону і шматвобразная па форме яе вырашэння, — пераход ад дзіцячай радасці да забабоннага страху ў І акце, пяшчотны, крапальна-паіўны смутак II акта; драматычная напружанасць, поўная рашучасці і адчаю, III акта. Засл. артыстка БССР В. Малькава валодае выдатнымі вакальнымі данымі — яна лёгка спраўляецца з цяжкай вакальнай партыяй. Тым больш хацелася-б, каб яна стварыла ў поўнай меры задуменна-сумны вобраз маладой японкі. Аднак, тэхнічна музыкальна правільна выкананая партыя не ўсюды прасякнута глыбокай шчырасцю ўнутраных перажыванняў, часта жэсты замяняюць пачуцці. З. Пукст (Сузукі) валодае сакавітым, прыемнага тэмбру голасам. Асабліва добрая яна ў выкананні дуэта з Бэттэрфлей у другім акце («Фіялкі, персік, ружы...»)

Супярэчлівая па свайму зместу партыя Пінкертона не глыбока прадумана засл. артыстам БССР Лапіным — не адчуваецца страснасці (якая гучыць у аркестры) у яго выкананні ў І акце, страснасці, якая прымусіла яго «ажаніцца» з японкай. Больш пераканаўча прагучала яго партыя ў апошняй карціне — развітанне з домам Чыо-Чыо-Сан. Апрача таго, артыст Лапін грашыў нясвоечасовымі ўступленнямі, з прычыны чаго адчувалася некаторая няўвязка ў агульным сугуччы.

Шарплес (арт. Шэціхін), якому не ўласцівы моцныя ўнутраныя перажыванні, прайшоў нядрэнна, але даволі суха. Горо — хутчэй чалавек «сам себе на ўме», «прайдоха», плут, чым камічная фігура, якой ён часамі паказваў сябе перад публікай.

Трэба вітаць наватарства пастаноўшчыка — засл. артыста БССР Златагорава за купіраванне хора ў 1-м акце (што адбываецца зусім непрыкметна і скарачае і без таго доўгі 1-ы акт) і за завяршэнне оперы без меладраматычнага паяўлення Пінкертона і Шарплеса. Непрыемна маленькая дэталь, што Чыо-Чыо-Сан глядзіць на паявіўшыйся карабель крыху коса ў публіку — глядач з першага акта прывык ужо, што мора знаходзіцца проста перад ім, што фактычна і ажыццяўляецца ў апошнім акце оперы.

Аркестр у оперы «Чыо-Чыо-Сан» адыгрывае відную ролю, — фактычна ён з'яўляецца ілюстрацыяй да разгортваючайся дзеі. Ён рысуе японскі пейзаж, настрой герояў, атмасферу дзеі, праводзіць лейтматывы настрояў. Так, напрыклад, Шарплес абяцае Чыо-Чыо-Сан, што Пінкертон вернецца к сыну, і ў аркестры праходзіць арыёза Бэттэрфлей, дзе яна марыць аб шчасці. Пры ўспаміне аб птушыных гнёздах паяўляецца матыў, які іх характарызуе.

Дырыжор — засл. дзеяч мастацтваў БССР Шнейдэрман правёў оперу з вялікім майстэрствам і тэмпераментам, аднак неабходна звярнуць увагу на не заўсёды правільнае ўступленне салістаў, асабліва ў І-м акце, і некаторыя рытмічныя недакладнасці.

Цудоўны дэкарацыі мастака Нікалаева, асабліва дэкарацыя І акта: галінкі дрэў у белых кветках, воддаль мора, мяккія тоны — белыя, ружовыя і бледназялёныя. Цудоўны захады ў І-м і II-м акце, а таксама ўсход у III-м акце.

У заключэнне хочацца адзначыць недакладнасць, дапушчаную ў прадаваемых для публікі лібрэта оперы адносна месца набыцця сюжэта кампазітарам Пуччыні і некаторыя недакладнасці ў музычнай тэрміналогіі.

С. НІСНЕВІЧ.

✓ КАНЦЭРТНАЯ БРЫГАДА СТУДЭНТАЎ

Магілеўскі абласны аддзел мастацтваў арганізаваў канцэртную брыгаду, у якую ўвайшлі студэнты, скончыўшыя Магілеўскае музычнае вучылішча, студэнтка Мінскай кансерваторыі і старэйшы выкладчык вучылішча А. Ф. Боркус. Такім чынам у брыгадзе былі: 2 скрыпачы, 3 віяланчэлісты, 3 спявачкі, спявак і піяніст. Праграма канцэртаў складалася з сцэн оперы «Еўгеній Онегін» Чайкоўскага, якія выконваліся ў грыме і касцюмах, рамансаў і іншых твораў Чайкоўскага, Мендэльсона, Моцарта, Крэйслера, Рубінштэйна, Дунаеўскага і іншых кампазітараў, а таксама з украінскіх і беларускіх песень.

Брыгадай дадзены канцэрты на заводзе «Акцябр» у Свіслачы, у Асіпавічах, Бялынічах, у Шклове, на аўтарамонтным заводзе, шоўкавай фабрыцы і ў летнім тэатры Магілева.

Усяго брыгада дала 9 канцэртаў. Не гледзячы на невялікую колькасць канцэртаў, усё-ж трэба прызнаць своечасовасць і неабходнасць стварэння такіх брыгад.

Работа ў такіх брыгадах карысна і для ўдзельнікаў іх, бо яна прывучае студэнтаў да выступленняў перад слухачамі, прымушае іх больш старанна працаваць, больш упарта рыхтавацца да сваіх выступленняў.

Г. КАЛАТНОВЕР.

Кузьма ЧОРНЫ

ЗЯМЛЯ

Апавяданне

І кожны раз, калі, бывала, прыходзіў ён у суботу перад вечарам дадому, а ў панядзелак на світанні зноў адыходзіў на цэлы тыдзень, заўсёды ў яе душы заставаліся адчуванні нейкай бяды, якая немінуча павінна калі-небудзь з'явіцца. І некалькі дзён пасля гэтага мучылі яе цяжкія думкі аб дзецях. Было заўсёды так, што кожную суботу ўжо з поўдня Ганка, большая з дзяцей, раз-па-разу выбягала на дарогу і з расчараваннем адразу-ж варочалася назад.

— Каб скарэй той вечар, — скардзілася яна сабе і адразу зноў бегла на дарогу.

А, нарэшце, прыходзіў і вечар. Сонца заходзіла за вялікі лес, Ганка доўга стаяла на дарозе і, прыклаўшы руку да ілба, углядалася ў далечыню. Пасля заўважала на дарозе высокую постаць і як мага кідалася насустрач ёй. І ўрачыста варочалася дадому з бацькам. Вочы яе гарэлі, а гордасці не было канца.

Калі, бывала, спаткае яна на дарозе бацьку і кінецца да яго, той раней падніме яе высока на руках, некалькі разоў пацалуе, паставіць на зямлю, заўсёды патрэпле і паблытае на яе галаве густыя, жаўтаватыя ад сонца валасы і скажа:

— Ну, хадзем, дачушка! Мама здарова?

І, увайшоўшы ў хату, прывітаўшыся з меншымі і з жонкай, пабядуе:

— Божа мой, божа, хаця каб усё добра было.

Яна ведала, што гэта значыць. Гэта значыць, што ён баіцца, каб не прагналі з работы, каб як-небудзь пражыць на свеце, каб як-небудзь выкіравацца так, каб былі накормлены дзеці, каб усе былі здаровымі... Яна ведала, што ён тужыць ад таго, што не ўпэўнен, што скора не з'явіцца няшчасце.

Ён быў за аратага. Ён араў зямлю. Гэта пачыналася ранняй вясной, тады, калі зямля толькі-што вызвалялася з-пад снегу. Зямля прасіла плуга, і зямлі было многа скрозь, — куды ні глянь, была зямля князя Радзівіла, пана Шатровіча, пана Лечашынскага. Ён араў зямлю ў Лечашынскага.

Жыў ён у сваёй хаце. Хата засталася яму ад бацькі. Двор к хаце быў прыгароджан з выгана, а за выганам ішла дарога. Праз кіламетраў шэсць яна канчалася ў кляновых прысадах і там быў маёнтак Лечашынскага. Стаяла там нізкая і доўгая з смольнага дрэва будыніна, якая называлася «афіцына» і жылі ў ёй тыя парабкі, што наймаліся ў маёнтак з вясны і да позняй восені, калі канчалася праца ў полі. Гэта былі людзі «без сем'яў». Хто сям'і не меў, той адчуваў сябе вальней. Яму не рупіла тое, што ў нядзелю, калі не ішла ў полі работа, ён застанецца на цэлы дзень у той «афіцыне». Хто меў сям'ю кіламетраў за трыццаць, таго цягнула ісці ў нядзелю дадому, але гэтага зрабіць было нельга і дзень праходзіў сумна. Ганчын бацька быў шчаслівейшым, ён мог раз на тыдзень быць дома. І цэлы тыдзень, працуючы ў полі, ён думаў аб тым, што скора прыйдзе субота.

Гэта быў чалавек ціхі і працавіты. Можа, з прычыны такога складу натуры, ён і быў няспынна прывязан да сваёй сям'і, а, можа, таму, што дзяцей сваіх яму прыходзілася заўсёды шкадаваць? Тыдзень яму здаваўся доўгім і нудным і праца цяжкой і агіднай.

Якое яму было шчасце чуць у сваёй хаце галасы дзяцей і жонкі! Яна была малая ростам і шчуплая жанчына, часта яна здавалася яму малой дзяўчынкай. Але калі яны пачыналі гаварыць аб дзецях, якой моцнай і велічнай яна здавалася яму. Яна гадавала трое дзяцей, і як гадавала! Не дзіва гадаваць дзяцей у роскашы!

Адзін раз пані Лечашынская з сваім старэйшым сынам спацыравала поблізу гэтай хаты. Лёгкі фаэтон стаяў на ўзлеску, а ад лесу сюды вяла вузкая палявая дарожка, уся зарослая дробнымі жоўтымі кветкамі на высокіх сцяблах. Панскаму сыну было год пятнаццаць і следам за ім ішоў яго слуга, бравы малады мужчына. Гэтага мужчыну звалі Якім, а сапраўды ён зваўся Яўхім, і выбіўся ў панскія слугі з простых людзей.

Жанчына з той хаты на выгане несла з лесу вязанку сухога галля. Была позняя раніца, пані з сынам ішла ёй насустрач.

— Добры дзень, Зося, — сказаў Якім.

Некалі, у першай маладосці, Зося яму падабалася. Цяпер ён быў улюбёны панамі слуга, яму дазвалялася каля паноў трымаць сябе вольна.

— Добры дзень, — адказала Зося і пайшла шпарчэй, азірнуўшыся на сваю Ганку, якая валакла за сабою перакінуты цераз плячо пук сухіх яловых лап.

— Якое пекнае дзіця! — сказала пані Лечашынская, гледзячы на Ганку. — Як ты завешся?

Зося скінула з плеч на зямлю галлё і адказала:

— Ганкай яна завецца, мая пані.

— Цяжка несці? — запыталася пані.

— Цяжка, панечка, — паскардзілася Зося. І падумаўшы, адважылася сказаць яшчэ: — Цяжка, кепска жывецца. У Ганкі сукенкі няма, толькі гэты рызман, што на ёй.

— Мужа няма? — запыталася пані.

— Муж ёсць, у вашай ласкі за аратага. Жыве ў афіцыне.

— А, гэта мае людзі, — сказала пані і дала Ганцы нейкую дробную манету.

Якім паглядзеў на Зосю і міргнуў, каб яна дзякавала паню. Зося сказала:

— Не, панечка, я не на тое кажу, я проста так, бо і галодна і холадна. Зямлі ў нас няма ні кавалачка, з працы адных рук жывём... Панечка, ведаеце, я ўжо адважуся... Тым годам вы прадавалі зямлю. Мой муж прасіўся, каб яму на выплату на пяць год хоць два маргі, усё-ж такі ён ужо гадоў пятнаццаць арэ вам гэтую зямлю. Але пан не дазволіў на выплату.

І цяпер не ўся яшчэ тая зямля прададзена, якую пан намерыўся прадаць, яшчэ ўсё купцы прыходзяць. Можа-б вы добрым сваім сэрцам замовілі слова перад панам на нашу просьбу. Гэта было-б нам шчасце. Ну, што-ж, вырастуць дзеці, дык думка не дае жыць, — на якое шчасце яны растуць і як яны жыць будуць.

Пані ніколі не ўмешвалася ў гаспадарчыя справы свайго мужа, у іх яна нічога не разумела. Яна паглядзела на Ганку і пайшла далей. У доме яна сказала мужу аб Зосінай просьбе. Яна гэта сказала з нервовай раздражненасцю. Зосіна просьба вывела яе з спакойнага ўраўнаважання душы, калі яна цешылася з харастваў прыроды. Гэта было ў суботу зранку. Перад вечарам Якім сказаў Зосінаму мужу:

— Твая жонка злавіла на дарозе паню і прасіла яе аб зямлі. Няхай яна больш так не робіць, пан выйдзе з цярплівасці і табе будзе бяда.

Ідучы дадому ў той вечар, чалавек перажываў смутак і злосць. Ён быў чалавек залежны, ён жыў з сваёй працы на зямлі, але гэта лічылася панскай ласкай на панскай зямлі. І сцежка, па якой ён ідзе, і ўвесь абшар да лесу і за лесам — усё гэта чужое, па якім можна толькі прайсці. Як цесна жыць у шырокім свеце!

Ганка бегла насустрач і смутак быў у чалавека яшчэ большы, калі ён узяў на рукі сваю белагаловую дзяўчынку.

Праз два месяцы была ўжо сапраўдная вясень. Праз некалькі дзён скончыцца праца на полі, усю зіму трэба будзе жыць дома без заработку.

Зранку туман вісеў над зямлёй. Чалавек выязджаў з параконным плугам на поле. З панскага саду выехаў абоз з яблыкамі. За заднім возам ішоў нізкаросллы парабак Іван Прастарэцкі.

— Іван, дай яблык, — гукнуў чалавек.

— Бяры, братка, толькі не многа.

Чалавек саскочыў з каня і стаў пакаваць яблыкамі кішэні. Пасля пхаў яблыкі за пазуху, у шапку.

— Пакінь, не можна, — прасіў Іван.

— Гэта панскія, што ты шкадуеш... Братка, заўтра субота, пайду дадому, выбяжыць Ганка насустрач, а я ёй гасцінец. Я-ж колькі жыву, ніколі не мог прынесці дзецям гасцінца.

І тут падбег панскі слуга Якім.

Дзве гадзіны чалавек перажываў душэўнае прыгнечанне і знявагу. Аканом яго лаяў і тыкаў пальцамі ў яблыкі, якія чалавек акуратна выклаў на стале. Пасля прыйшоў сам пан Лечашынскі і сказаў:

— З гэтага дня прагнаць, не заплаціць за месяц, бо хто ведае — пакража летам напэўна ішла праз яго рукі.

Чалавек асмеліўся ўспомніць аб чалавечым сумленні:

— Паночку, а калі ў мяне дзіця...

— Што тваё дзіця! Ты злодзей!

— У пана-ж вагоны яблык! Бог стварыў, як той казаў, зямлю для ўсіх роўна...

Пан больш не слухаў.

«Што мае дзіця!»—думаў чалавек. Каб не такая панская пагарда да дзіцяці, чалавек можа-б і адышоў душой ад злосці. Але за дзіця чалавек дараваць не мог. Апаўдні ён прыйшоў дадому выгнаны і зняважаны.

У канцы верасня парабкі шукалі збеглага пана Лечашынскага. Удосвецe чалавек убачыў яго: у сялянскім кажуху ён ішоў выганам паўз хату, і чалавек пайшоў за ім следам. Пан адчуў на сабе ненавідны позірк, шпарка павярнуўся да чалавека і пазнаў яго. І тое, што ўбачыў ён у чалавечых вачах, жахнула яго. Ён выхапіў наган і стрэліў...

Вясной чалавек працаваў на свядоё уласнай зямлі. Ганка з меншымі гуляла поблізу. Раптам яна закрычала і кінулася к бацьку, але бацька быў за ўзгоркам.

— Пачакай, пачакай, — крычаў з-за дрэва мужчынскі голас. — Не бойся, гэта я, пакліч тату.

Чалавек выйшаў з плугам з-за ўзгорка і ўбачыў Ганку.

— Што, што, чаго ты?

— Панскі Якім у лесе! — крычала Ганка.

Чалавек зняў шапку і абцёр з ілба пот.

«Не можа быць», — сказаў ён сам сабе.

Увечары, калі ён прыехаў дадому, Зося выбегла яму насустрач. Бачачы яго радасны твар, яна і сама засвяцілася шчаслівай усмешкай і сказала:

— Сёння злавілі бандыта. Ён сказаў, што ў лесе яшчэ Якім. Пан Лечашынскі пакінуў іх не дараваць за зямлю.

Ганка-ж нічога не хацела слухаць. Ёй было вельмі прыемна выводзіць з аглабель за повад уласнага бацькаўскага каня.

Адказны рэдактар І. Д. ГУРСКІ.

У4101. Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць штотыднёва. Мінск, друкарня «Звязды».